# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гарэму Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАЧЫ—XV
№ 124 (4628)
ПАНЯДЗЕЛАК, 11 МАЯ 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬМЕРАЛЬНІЦА


## 200 новых калгасьнікаў

БАРЫСАЎ. У час сяўбы значна ўзмацніўся калектыўны рух. У старыя калгасы ўступіла 200 бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Арганізаваны новыя калгасы «Бальшавік» з 40 гаспадарак і «Чырвоны поваселец» з 40 гаспадарак. У Хаўполіцкім сельсавеце вёска Завоста цалкам уступіла ў калгас імя 1-га мая. У вёсцы Восава арганізаваны новы калгас «Бальшавік Барысаўшчыны». У вёсках Рагатка і Хаўпольцы арганізаваны ініцыятыўныя групы.

Багдан.

## Зьдзельшчына падвоіла выпрацоўку

ГОМЕЛЬ. Калгас «Чырвоны хлебароб», Гомельскага раёну, дае прыклады павышэньня прадукцыйнасьці працы пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны. Так, да ўвядзеньня зьдзельшчыны пасевы расьлін у парніках—чатыры рамы на калгасьніка ў дзень, пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны—12 рам. Да ўвядзеньня зьдзельшчыны калгасьнік плёў 4 з палов матыі, пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны—7 з палов. Пікіроўка расады да ўвядзеньня зьдзельшчыны 1.500, сьцяблі[illegible] ўвядзеньня—3.000.

## НА ШЛЯХУ ВЫРАШЭНЬНЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭХКУЛЬТУР

Арганізацыя буйных калгасаў і саўгасаў зьяўляецца асноўным сродкам вырашэньня праблемы тэхкультур. Толькі пераход вытворства тэхкультур на рэйкі буйнога сацыялістычнага зямляробства даў магчымасьць дасягнуць нябачаных посьпехаў на шляху стварэньня сырцовай базы для нашай прамысловасьці.

У гэтым годзе павінна быць засеяна ільнам 240.000 гэкт. супроць засеву 135.000 у 1927 г., канапель — 40.000 гэкт. супроць 21.000 гэкт. у 1930 г.

Механізацыя ільнаапрацоўкі стварае стымул для яшчэ большага пашырэньня плошчы пад пасевамі ільну і канапель. Сёлета ў БССР будзе пабудавана 46 ільнаапрацоўчых заводаў. Мэханізацыя вызваліць ад значнай часткі цяжкіх работ па першапачатковай апрацоўцы ільну. 14 МТС, якія арганізуюцца ў ільнаканаплядводчых раёнах, падводзяць перадавую тэхнічную базу для далейшай рэканструкцыі сацыялістычнага ільнаводства. Усе гэтыя мерапрыемствы пры актыўнай мабілізацыі калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас ствараюць поўную магчымасьць для выкананьня плану пасеву тэхкультур у 1931 г. і для вырашэньня праблемы тэхкультур у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Адно пашырэньне пасеву плошчы яшчэ ня можа даць жаданага эфэкту. Змагаючыся за ПОЎНАЕ выкананьне і перавыкананьне пасеву, трэба паставіць на меншу важную задачу па ЎЗДЫМЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ. Факты гавораць, што на даным вучастку мы маем адставаньне. Даныя паказваюць, што ўраджайнасьць тэхкультур у БССР яшчэ вельмі нізкая. Так, ураджай сеня ільну ў 1930 г. складаў толькі 2,6 цэнтн. з гэктара, валакна — 2,03 па канаплях—сеня 3,45 цэнтн., валакна — 3 цэнтн.

Гэтыя лічбы стаяць перад усімі партыйна-савецкімі і зямельна-калгасными арганізацыямі раёну неадкладную задачу барацьбы за ЯВЫШЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ тэхкультур. Ня толькі засеець неабходную плошчу, але і зьняць МАКСЫМАЛЬНЫ ЎРАДЖАЙ—вось задача, якая стаіць перад намі. Ураджайнасьць ільну і канапель у 1931 годзе павінна значна перавысіць ураджай мінулых год.

Адной з прычын нізкай ураджайнасьці зьяўляецца апартуністычная недаацэнка аграмерапрыемстваў, ігнараваньне дырэктыў вышэйшых органаў аб вачыстцы насеньня, нядбайлівыя адносіны да пасева і поліва іх. У мінулым годзе мы мелі рад фактаў, калі пасевы ільну зьнішчаліся пустазельлем. Сёлета гэтыя факты не павінны мець месца. ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АГРА-МІНІМУМУ, СВАЯЧАСОВАЕ ПОЛІВА І ЎБОРКА ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРАВЕДЗЕНЫ Ў ЖЫЦЬЦЁ.

Ільнаводчыя раёны стаяць на парозе МАСАВАЙ СЯЎБЫ. Посьпехі веснавой кампаніі будуць залежаць выключна ад падрыхтаванасьці калгасаў і аднаасобнага сэктору да сяўбы. Яны будуць залежаць ад таго, як раённыя арганізацыі мабілізуюць калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх масы на барацьбу за вырашэньне праблемы тэхкультур.

Мы павінны адзначыць рад ганебных фактаў, якія паказваюць, што апартуністычная недаацэнка тэхкультур, жаданьне выцісьнуць іх з агульнага севазвароту пашыраюць месца. Чаго варты такія факты з Касьцюковіцкага раёну, дзе СКАРАЦІЛІ пляны пасеву пад ільном на 1.589 гэкт., ва Ўраравіцкім раёне — на 250 гэкт., а Ільнаканаплядводцэнтр скараціў плошчу па сыстэме саўгасаў на 600 гэкт. па ільне і на 1.100 гэкт. па канаплях. Тут мы маем праяву махровага апартунізму на практыцы, па якой трэба ўдарыць з усёй сілай.

Ёсьць раёны, якія зразумелі палітычную важнасьць праблемы тэхкультур, дзе актыўная работа з калгасьнікамі, бядняцка-сераднякімі масамі выклікала хвалю сустрэчных пасеўпланаў. СТАРАДАРОСКІ раён ПАВЯЛІЧЫЎ плошчу пасеву пад лён на 450 гэкт. і канапель — на 219 гэкт., а Лепельскі—на 330 гэкт.

Апартуністычныя скажэньні некаторымі раёнамі дырэктыў вышэйшых органаў павінны быць зараз-жа выпраўлены. ПРЫКЛАДЫ ПЕРАДАВЫХ РАЁНАЎ, ЯКІЯ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ЛЁН, ПАВІННЫ БЫЦЬ ПАДХОПЛЕНЫ АСТАТНІМІ РАЁНАМІ. Ніводнага незасеянага гэктара зямлі, вызначанага пад лён.

Асаблівую ініцыятыву ў барацьбе за якасьць ільну павінны ўзяць на сябе МТС і САЎГАСЫ. Увядзеньне зьдзельшчыны і арганізацыя сацспаборніцтва ў калгасах зьявяцца магутнымі вагарамі ў барацьбе за выкананьне плянаў і ўздым ураджайнасьці тэхкультур. Партыйна-камсамольскія арганізацыі павінны дабіцца таго, каб сацыялістычныя формы і мэтады працы ў калгасах і саўгасах зьяўляліся штодзённым мэтадам барацьбы ня толькі за колькасныя паказьнікі, але і за якасныя.

Для ажыцьцяўленьня паказаных задач рэалізацыя гістарычнай адозвы партыі і Ураду аб КАНТРАКТАЦЫІ мае рашаючае значэньне. Кантрактацыя, як двухбаковае абавязацельства паміж кантрактантамі і дзяржавай, павінна быць цесна ўвязана з агра-вытворчай дзейнасьцю ў часе веснавой сяўбы.

Трэба весьці рашучую барацьбу з недаацэнкай індывідуальнага сэктару. Нельга забываць аб тым, што аднаасобны сэктар павінен будзе здаць дзяржаве 65 проц. усяе прадукцыі ільну. Аднаасобнікі павінны будуць засеяць 174 тыс. гэктараў пад лён і канаплі. Гэта важнейшая задача будзе выканана, калі раённыя арганізацыі будуць весьці шырокую масавую работу ў часе палявых работ, цесна ўвязваючы яе з арганізацыяй калгаснага прыпіву. Гэта будзе дасягнута, калі кожны калгасьнік і аднаасобнік, працуючы на попі, будуць ведаць узятыя на сябе абавязацельствы па кантрактацыі. Працоўныя масы вёскі павінны ведаць, што нашым фабрыкам трэба даць сырэц у патрэбнай колькасьці і вышэйшага гатунку.

Ударыць па тых фактах, якія мелі месца ў некаторых раёнах у мінулым годзе, калі кантрактацыйны дагавор дзеньдзе разглядалі, як аднабаковае абавязацельства, калі органы забесьпячэньня і каапэрацыі некаратна выконвалі свае абавязацельствы па выдачы кантрактантам-хлеба, жмыхоў, масла, сродкаў вытворчасьці і г. д.

Мільённыя асыгнаваньні дзяржавы пад кантрактацыю тэхкультур, накіраваньне ў вёску машын, тавараў, прадукцыі і г. д. ствараюць усе ўмовы для барацьбы за вырашэньне праблемы тэхкультур. Раённыя арганізацыі павінны давесьці да працоўных мас вёскі аб усіх гэтых мерапрыемствах дзяржавы і наладзіць правільнае разьмеркаваньне сродкаў, што накіроўваюцца ў вёску. Даць цьвёрдыя заданьні ўсім кулацкаазможным гаспадарам. Усе назавыя партыйна-савецкія арганізацыі, кожны сельсавет і член сельсавету нясуць адказнасьць за кожны незасеяны гэктар тэхкультур.

Плян КАНТРАКТАЦЫІ на сёньшні дзень выканан толькі на 72 проц. па ільне і на 87 проц. па канаплях. У нядаўна надрукаванай пастанове ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і правядзеньні кантрактацыі ільну і канапель у Заходняй вобласьці адзначана: «Слабая прапрацоўка ў масах калгасьнікаў адозвы ЦК і СНК ад 25 студзеня г. г. аб кантрактацыі, адсутнасьць поўнай мабілізацыі калгасных і бядняцка-сераднякіх мас вёскі вакол пытаньняў пашырэньня пасеву ільну і канапель, невыстарчальная папулярызацыя льгот пасеўшчыкам ільну і канапель, недаацэнка асобнымі абласнымі і раённымі арганізацыямі значэньня кантрактацыі і роллі аднаасобных гаспадарак у справе пашырэньня пасеву ільну і канапель — усё гэта паслужыла прычынамі зусім нездавальняючага разгортваньня кантрактацыі ільну і канапель, і слабай арганізацыі пасеву гэтых культур». Паказаныя ЦК УсеКП(б) прычыны слабога разгортваньня тэмпаў сяўбы і невыкананьня поўнасьцю плянаў кантрактацыі характэрны і для БССР. Ліквідацыя паказаных недахопаў, болвее правядзеньне сяўбы ў ільнаводчых раёнах—задача ўсіх арганізацый.

Выкананьне пастаўленых задач павінна праходзіць ва ўмовах максымальнай напружанасьці сіл мясцовых арганізацый і пры актыўнай мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці вёскі. На шляху вырашэньня праблемы тэхкультур будзе стаяць рад труднасьцяй. Большавіцкае перамаганьне гэтых труднасьцяй зьяўляецца задачай кожнага раённага работніка. Кулак будзе старацца сарваць сацыялістычную спэцыялізацыю сельскагаспадаркі. Ён будзе агітаваць за скарачэньне пасеву тэхкультур, будзе агітаваць супроць агра-мінімуму і кантрактацыі. Бязьлітасная барацьба з кулаком і яго агентам — апартуністам павінна пранізаць усе этапы ільнянога вытворства. Сацыялістычная прамысловасьць павінна атрымаць максымальны ўраджай тэхкультур.

## Правадыр грузінскіх меншавікоў Ной Жорданія на службе ў царскай ахранцы

ТЫФЛІС, 7 мая. У «Заре Востока» ад 6 мая надрукаваны артыкул пад загалоўкам «Ной Жорданія на службе ў царскай ахранцы» са здымкамі дакумантаў, якія падаюцца ў гэтым артыкуле.

Для характарыстыкі Ноя Жорданіі, гэтага прызнанага лідэра і тэарэтыка меншавізму Грузіі, для высьвятленьня яго фізіяномі, ды і меншавіцкай партыі ў цэлым, надзвычайны цікавасьць набываюць тыя матар'ялы, якія ўдалося знайсьці ў справах Цэнтрархіву Грузіі.

У 1901 годзе на западозраньні ў прыналежнасьці да сацыял-дэмакратычнага гуртка інтэлігентаў, быў арыштаваны і рад асоб, у тым ліку Курнатоўскі, Філіп Махарадзе, Джыбладзе, Каладзе, Францескі, Каладзе і Жорданія. Апошнія два былі пасаджаны ў Кутаіскую турму.

Не пасьпеўшы пасядзець у турме 5 дзён, Жорданія піша доўгую заяву на імя «яго высокаблагародзія начальніка тыфліскага губернскага жандарскага кіраўніцтва».

У гэтай першай заяве Ной Жорданія кланяецца ў сваім вернападданстве і гатоў адмовіцца ад «літаратурных заняткаў і палітычных патрасеньняў». І нарэшце, што асабліва абурае, зьвяртаецца да «гуманнага пачуцьця жандарскага генэрала».

Прайшло два месяцы. Жандармэрыя на сьпішалася з адказам. Ні тон, ні вымест ліста Жорданіі не аказалі на яе ўзьдзейнічаньня. Ной нервуецца, ён ня можа зьмірыцца з турэмным заключэньнем, тым больш, што «не адчувае за сабой ніякай віны» супроць самаўладзтва, ён можа зразумець, чым ён заслужыў такія адносіны да сябе. Жорданія піша ўжо трэцюю заяву.

З Кутаіскай турмы Жорданія перавозіцца ў Метэхскі замак.

Хоць тут, у параўнаньні з рэжымам для іншых палітзьняволеных, адносіны да іх і ўмовы яго заключэньня былі, безумоўна, лепшыя, тым ня менш агульная абстаноўка Метэхскага замку і досыць доўгае заключэньне прыводзіць Жорданія ў сапраўдную паніку. Ён кідае жандармскае кіраўніцтва сваімі заявамі.

Усяму бывае канец. Дачакаўся допыту і Ной Жорданія. Спытныя царскія агенты, якія штучна зацягвалі справу, натуральна, не маглі ня выкарыстаць малалушнасьць і страх чалавека, які з-за асабістага дабробыту гатоў быў ісьці на якія ўгодна крокі.

Жандары не памыліліся ў сваіх разьліках. Ной Жорданія выдаў ім ні адну таямніцу. Пасьля заканчэньня допыту, жандармская ўправа атрымала магчымасьць напісаць і паслаць у дэпартамант паліцыі вялікі даклад аб сацыял-дэмакратычным руху Грузіі і ролі ў ім адзельных асоб.

У гэтым дакладзе зьвяртае на сябе ўвагу наступнае месца: «Допытамі нагванага Жорданія, якія адбываліся кожны дзень з 23 лютага г. г. па 21 сакавіка, высьветлена шырокае кола асоб, якія вялі вераніску з Ноем Жорданія. Некаторыя з іх прыцягнуты ўжо да адказнасьці згодна з гэтым дазнаньнем, другія-ж будуць прыцягнуты».

Каб кунціць сабе савадоку (для паездкі на заграніччы курорт), Ной Жорданія пачаў здраднічва выкрыў ніці сацыялдэмакратычнай арганізацыі. Пасьля яго гутаркі з жандарам у царскі засьценак быў кінуты рад рэвалюцыйных дзеячоў. Рабочаму руху Грузіі быў нанесен здрадніцкі ўдар.

Апошні дакумант Ноя Жорданія на імя начальніка тыфліскага губернскага жандарскага кіраўніцтва адносіцца да 7 чэрвеня 1902 году

«Прашу Вас паведаміць мяне, колькі часу я павінен быць яшчэ зьняволеным, ці няма якой-небудзь магчымасьці, пры якіх-бы там ні было ўмовах, вызваліць мяне з-пад варты». І сапраўды 12 чэрвеня 1902 году Ной Жорданія быў вызвалены.

## *Жахлівыя вынікі паводкі ў Зах. Беларусі*

### ЦЭЛЫЯ ВЁСКІ ЗЬНЕСЕНЫ З АБЛІЧЧА ЗЯМЛІ

## Тысячы сем'яў—пад адкрытым небам

### *ГОЛАД СЯРОД ПАЦЯРПЕЎШЫХ*

ВІЛЬНЯ, 10. Кожны дзень буржуазны друк фашысцкай Польшчы падае ўсё новыя і новыя даныя аб тым вялізарным разбурэньні, якое нанесена паводкаю працоўным Зах. Беларусі, а таксама аб тым жахлівым становішчы, у якім знаходзяцца пацярпеўшыя ад паводкі. Так, эндэцкі «Дзеньнік Віленскі» ў нумары 106 і «Кур'ер Віленскі» № 107 пішуць: «З усіх канцоў Віленшчыны кожны дзень паступаюць весткі аб разбурэньні, якое нанесена паводкаю на вялікіх абшарах. Асабліва вялізарныя разбурэньні зроблены паводкаю ў ВІЛЕНСКА-ТРОЦКІМ ПАВЕЦЕ, дзе адна ВЁСКА ШУРМАНЦЫ ЗУСІМ ЗЬНЕСЕНА З ТВАРУ ЗЯМЛІ. УСЕ ПАСЕВЫ ЗАНЕСЕНЫ ПЯСКОМ І ІЛАМ, ТАЎШЧЫНЁЮ ДА 1 МЭТРА. У аднаго-ж селяніна вадою зьнесена 1½ гэкт. зямлі, і селянін, які перад паводкай меў 4 гэкт. зямлі, зараз мае толькі 2½.

У ВІЛЕНСКІМ ПАВЕЦЕ ПАВОДКАЮ ЗЬНІШЧАНА НЕКАЛЬКІ ВЁСАК, У ПАВЕЦЕ МАЛАДЗЧАНСКІМ ЛІТАРАЛЬНА ЗЬНІШЧАНЫ ТРЫ ВЁСКІ, У ДЗІСЬЕНЕНСКІМ — 8 ВЁСАК, У БРАСЛАЎСКІМ — 66 ГАСПАДАРАК ЗЬНІШЧАНЫ ТАК, ШТО НЯМА НІЯКАЙ НАДЗЕІ НА ІХ НАПРАВУ».

Зразумела, што ўсе гэтыя даныя аб зьнішчэньні паводкаю ў Заходняй Беларусі, узятыя з фашысцкай прэсы за адзін толькі дзень, ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ДАЛЁКА НЯПОЎНЫМІ.

Як зазначае далей фашысцкі друк, «ЗРУЙНАВАНАЕ СЯЛЯНСТВА ЦЕРПІЦЬ ГОЛАД І ХОЛАД, БО ЗАПАСАЎ НЯМА, ДАПАМОГІ — НІАДКУЛЬ НІЯКАЙ, А НАЧАВАЦЬ ТРЭБА ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ, БО АД БУДЫНКАЎ НЕ ЗАСТАЛОСЯ І СЬЛЕДУ. ЗЬНІШЧЭНЬНЕ ТАКОЕ ЖАХЛІВАЕ, ШТО, ГЛЕДЗЯЧЫ НА РУІНЫ СВАЁЙ ШМАТГАДОВАЙ ПРАЦЫ, НЯ ТОЛЬКІ ЖАНЧЫНЫ І ДЗЕЦІ, АЛЕ НАВАТ І МУЖЧЫНЫ ПЛАЧУЦЬ».

Вось якімі фарбамі малюе становішча пацярпеўшых ад паводкі, працоўных Зах. Беларусі нават фашысцкі друк. Становішча пацярпеўшых ад паводкі зьяўляецца тым больш распачлівым, што ФАШЫСЦКІ ЎРАД НА ДАПАМОГУ ІМ НЕ АСЫГНАВАЎ НІ КАПЕЙКІ, ПАКІНУЎ ІХ НА ВОЛЮ ЛЁСУ.

## Разгром яўрэйскага школьніцтва ў Вільні

ВІЛЬНЯ, 10. Пасьля разгрому беларускіх і украінскіх культурна-асьветных арганізацый і ўстаноў, школьніцтва і г. д. польскі фашызм прыступіў зараз да разгрому і фашызацыі яўрэйскага школьніцтва. Як падае фашысцкі «Кур'ер Віленскі» у № 107, гэтымі днямі па загадзе віленскага школьнага куратара п. Шэленгоўскага, у Вільні закрыта 8-мі клясовая жаночая школа імя Фруга, якая існуе 23 гады і ў якой навучаецца зараз 450 дзяцей. Адначасова па загадзе таго-ж школьнага куратара закрыта і адзіная ва ўсёй Польшчы яўрэйская настаўніцкая сэмінарыя.

Прычынай закрыцьця, паводле фашысцкага друку, зьяўляецца нібы, камуністычная дзейнасьць, якую вялі вучні гэтых школ. Так, у апраўданьне гэтага кроку куратара газэта зазначае, што ў сьнежні мінулага году 28 вучняў семінарыі былі арыштаваны па «камуністычным сходзе». У сапраўднасьці-ж яны былі арыштаваны ў ліку 100 асоб на дазволеным-жа фашысцкай уладаю вечары, у часе якога ўдава памёршага лідэра Бунду Мэдэм рабіла даклад аб сваёй паездцы па СССР.

Разгром яўрэйскага школьніцтва з мэтаю яго фашызацыі выклікаў вялізарнае абурэньне сярод яўрэйскай грамадзянасьці Вільні.

## Фашысцкі ўрад узмацняе тэрор

### Кат-Зарэмба зноў у луцкай ахранцы

Крывавыя расправы польскіх дэфэнзыўных катаў над палітзьняволенымі ў луцкай ахранцы сталі вядомымі ўсяму сусьветнаму пралетарыяту.

Масавыя забойствы рэвальцыйных рабочых і сялян, жудасныя катаваньні, у часе якіх арыштаваным праз нос ўліваласа заражоная мача, масавыя гвалтаваньні жанчын — усе гэтыя нячуваныя практыкі фашысцкіх катаў выклікаюць жах у кожнага працоўнага і адначасова пратэстаньне бязьлітаснай помсты Луцк у вачох працоўных усяго сьвету стаў сымбалям панаваньня дыктатуры фашызму насуп. Дзякуючы рашучаму пратэсту з боку рабочай клясы Польшчы і ўсяго сьвету, зарваўшыся обэрбат міністар Складкоўскі прымушаны быў адклікаць кіраўнікоў луцкай ахранкі, прызначыўшы на пасяджэньні фашысцкага сойму, што «ня ўсё там было ў парадку».

Зволеных заправіл луцкай дэфэнзывы, Недзялкоўскага, Зарэмбу і Ткачука прыгарнуў пад свае крылы вялвода Юзэфскі, гэта ня менш усім вядомы вешацель і «пацыфікатар» украінскага працоўнага сялянства. Усе яны былі вызначаны рэфэрэнтамі бясьпечнасьці ў Луцку і Сарнах. Але фашысцкая ахранка не змагла абыйсьціся без такіх ваіх стаўпоў, як Зарэмба і інш.

Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік» з 9-га мая, міністар Складкоўскі зноў выклікаў на «працу» у луцкай ахранцы Зарэмбу і К°.

Фашысцкі ўрад такім чынам афіцыяльна прызнаў тую сыстэму катаваньняў і забойстваў палітзьняволеных, якую праводзілі Зарэмба, Ткачук і іншыя дэфэнзыўныя каты.

## Польскі фашызм узмацняе тэрор

### *ФІЗЫЧНАЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН У ТУРМАХ*

### Катаваньні і забойствы палітзьняволеных—штодзённае зьявішча

### (Ліст палітзьняволеных горадзенскай турмы)

Палітзьняволеныя горадзенскай турмы пішуць, што жывуць у жахлівых умовах, якія пануюць у вастрозе. З кожным днём узмацняюцца рэпрэсіі. Турэмная адміністрацыя зрабіла замах на цэласьць камуны палітычных і на бібліятэку. Гігіенічна-санітарныя ўмовы нязносныя: у адной камэры знаходзіцца 45-50 чал., некаторыя з якіх хворыя на адкрытыя сухоты. На такую камэру даецца толькі два кубкі, з якіх прымушаны піць усе 45 зьняволеных і такім чынам лёгка заражаюцца адзін ад другога. Палітзьняволеныя з прычыны дрэннага харчаваньня і вільгаці турэмных камэр, пачынаюць хварэць на сухоты. Лекавая дапамога выражаецца толькі ў тым, што мераць тэмпэратуру, даюць парашкі, або кладуць у турэмны шпіталь разам з крымінальнымі.

Вядомы турэмны кат з Люблінскай турмы, нехта Грабоўскі цяперашні начальнік горадзенскай турмы, выступіў супроць найважнейшага права палітзьняволеных—права дзяліць харчы паміж усімі палітзьняволенымі. Зьменшыў электрычнае сьвятло з 32 сьвечак да 16. Палітзьняволеныя вострa запратэставалі супроць новых замахаў на іх правы. Палітзьняволеныя Горадні вядуць ужо некалькі месяцаў барацьбу ў абарону сваіх праў.

На волі барацьбу палітзьняволеных, падтрымліваюць фашысты і сяляне: прымаюцца рэзалюцыі-пратэсты супроць катаваньняў палітзьняволеных, дэманстрантамі выбіта 8 шыб у памяшканьні начальніка турмы, у вакопіцах Горадні сяляне зьбіраюць прадукты для палітзьняволеных і г. д.

Ня глядзячы на рашучы адпор палітзьняволеных на замахі адміністрацыі, на іх здабытыя цматгадовай упартай барацьбой правы, пастуленьне адміністрацыі на палітзьняволеных усё разгортваецца і больш 200 палітзьняволеных амаль месяц застаюцца без харчовай дапамогі.

Палітзьняволеныя стаяць зараз зноў напярэдадні вострай барацьбы — галадоўкі. І яны зьвяртаюцца з наступным лістом да рабочых і сялян Горадзеншчыны, які з усёй яркасьцю малюе фашысцкія прыёмы фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыянэраў — палонных кайзэ капітану.

«За барацьбу супроць прыгнятальнікаў і эксплёататараў, фашысцкі ўрад кінуў нас у турэмныя казематы. Мы, палітзьняволеныя, рабочыя і сяляне, якія разам з вамі працавалі на фабрыцы і ў полі, ня толькі ня можам цяпер дапамагчы вам у вашай барацьбе, але, наадварот, вароўтаемся да вас з заклікам:

Дапамажэце нам у нароўнай барацьбе, якую нам прыходзіцца бязупынна весьці з турэмнай адміністрацыяй — турэмнымі катамі.

Катаваньнямі, якія напамінаюць сярэдневяковую інквізыцыю, польская дэфэнзыва хоча забіць у нас імкненьне да лепшага жыцьця. Кіму не вядомы гетыя катаваньні? Зьвязваюць рукі і ногі, прасоўваюць палку паміж рукамі і каленямі, робяць з чапавека футбольны мяч, падымаюць высока і з усёй сілай кідаюць яго на падлогу. У рот запіхваюць брудныя шматы, б'юць гумовымі палкамі, б'юць некалькі начой да страты прытомнасьці. У дадатак да гэтага ўжываюць і іншыя катаваньніі. Уліваюць воду ў нос, якую часта зьмешваюць з воцатам або з мачой), паліваюць ваду ў камэру, кідаюць туды зьвязанага таварыша. Гэтым сродкам яны «прыводзяць да прытомнасьці». Вось яна «праца» дэфэнзывы! Праўда, яны надламалі нас фізычна, большасьць нашых таварышоў хворыя, але баявы дух, наша жаданьне змагацца — гэтага ім зламаць ня ўдасца.

Фашысцкая турэмная адміністрацыя імкнецца давесьці да канца справу, пачатую дэфэнзывай. Ёй мала таго, што многія з нас застануцца навекі калекамі —яна хоча нас зьнішчыць фізычна.

Усе нашы «правы», якіх мы дабіліся ў вострай барацьбе, галадоўкамі—цяпер адбіраюцца. Нас пазбавілі газэт, кніг, сышыткаў. Адміністрацыя не дапускае лякарства з волі, турэмны доктар ня хоча лячыць. Яго адносіны да нас нечалавечыя. Нічога дзіўнага, што колькасьць хворых сярод нас павялічваецца хутка. Нічога дзіўнага, што на працягу аднаго толькі месяца памёр тав. МІКАДАЙЧЫК, ды павесілі тав. КУЧКО. У палітзьняволенага ТАРЛОЎСКАГА ўкралі пачку харчоў, якую яму прыносіла яго маці, а ў Паўла БАНДАРЭВІЧА ўкралі 25 даляраў, якія прыслаў яму яго брат з Амэрыкі.

Турэмная адміністрацыя, пачынаючы ад начальніка і канчаючы наглядальнікамі, настаянна чапяецца да нас, шукае повадаў, каб нас пакараць, каб справакаваць галадоўку і мець магчымасьць нас катаваць. За ўслякую дробязь караюць карцарам, садзяць на хлеб з вадой, ізалююць, адбіраюць сяньнікі і г. д. Усё гэта стала штодзённым зьявішчам у жыцьці палітзьняволеных.

Біць палітзьняволеных стала для фашысцкіх турэмных катаў сьвятым абавязкам. Мы пішам вам, рабочыя і сяляне, каб вы ведалі, як і хто мучае нас. Па загадзе начальніка турмы білі палітзьняволеных—Піонжок — былы царскі жандар, Крэўэз — былы нямецкі жандар і цэлы рад іншых «гэрояў».

Таварышы, рабочыя і сяляне! 200 палітзьняволеных горадзенскай турмы звяртаюцца да вас за дапамогай. Няхай прадажныя сабакі, крываждушныя лёкаі буржуазіі ведаюць, што мы, палітзьняволеныя, гатовы і тут, у турме весьці барацьбу за нашы правы. У нашай барацьбе мы можам атрымаць дапамогу толькі ад вас, таварышы. Таму звяртаемся да вас, таварышы, з заклікам:

— Дапамажэце нам у нашай барацьбе! Няхай ведаюць фашысцкія каты, што мы не адны, што за нас жалезнай сьцяной стаяць рабочыя і сяляне!».

## Аўладаньнем пралетарскай навукі ўдарым па фашысцкіх акупантах

Заслухаўшы інфармацыю аб нячуваным сэрорам, які праводзіцца фашысцкімі акупантамі на Зах. Украіне і Зах. Беларусі, агульны сход студэнтаў пэдфаку БДУ адзначае:

Голад, жабрацтва, бязьлітасная эксплёатацыя, вялізарная армія беспрацоўных, якая з кожным днём усё больш павялічваецца, непасільны цяжар падаткаў і паставіны разгул фашысцкага бізуна—вось, што характарызуе сучаснае становішча рабочае клясы і працоўнага сялянства ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Фашысцкая Польшча, якая знаходзіцца ў тупіку эканамічнага крызісу адзіны выхад са становішча бачыць у бязупынным падрыхтоўцы ўзброенага нападу на СССР і ў задушэньні нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны, якія свае рэвалюцыйныя барацьбой перашкаджаюць ажыцьцяўленьню злачынных планаў польскіх імкарыялістаў.

Разгром беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьне», разгром усіх культурна-асьветных і каапэрацыйных устаноў працоўнага сялянства, праваднымі арышт т. Тарашкевіча, жудасныя катаваньні лепшых барацьбітоў за пралетарскую рэвалюцыю ў засьценках Беластоцкіх, Кобрынскіх и Лідзкіх дэфэнзыў—усё гэта праводзіцца з мэтай узмацненага нападу на СССР. Уся гэта інтэрвэнцыяністская падрыхтоўка, а таксама задушэньне нацыянальна-вызваленчага руху адбываецца пры актыўнай дапамозе як польскіх сацыял-фашыстаў, так і беларускіх нацыянал-фашыстаў—Астроўскага, Луцкевіча і К°.

Агульны сход студэнтаў у адказ на фашысцкі тэрор абяцае з яшчэ большай напружанасьцю, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, працаваць над аўладаньнем пралетарскай навукі, над узмацненьнем вызнізацыі. Сход пастанаўляе яшчэ шырэй разгарнуць работу МОПР'а па дапамозе палітзьняволеным, якія пакутуюць у казематах фашызму.

Няхай жыве рэвалюцыйная змагаць Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне!

Няхай жыве КПП, КПЗБ і КПЗУ!

Няхай жыве сусьветная Кастрычнік!

## Далучаем свой голас да пратэсту мільёнаў

Працоўнае сялянства в. Слабада, Стара-Дарожскага раёну, даручае свой голас да пратэсту мільёнаў працоўных мас Савецкага Саюзу супроць крывавага разгулу польскага фашызму на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Зьвярскі разгром нацыянальна-вызваленчага руху, начуваны катаваньні палітзьняволеных у фашысцкіх «засьценках сьмерці», 13.000 лепшых змагароў за сусьветны кастрычнік, якія кінуты ў сырыя падзямельлі—вось крывавы шлях польскага фашызму і беларускіх надымнал-фашыстаў, якім яны імкнуцца падрыхтаваць узброеную інтэрвэнцыю супроць краіны Саветаў.

У адказ на тэрор фашысцкіх акупантаў агульны сход абяцае яшчэ больш рашуча змагацца за нацыёнаў за чатыры гады, за свячасовае праведзеньне другой бальшавіцкай сьлёзы.

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

## ШЛЯХ ДА САПРАЎДНАГА МІРУ—ГЭТА ПАРАЖЭНЬНЕ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ,

### Тав. Кашэн выкрывае антысавецкія пляны французскага імпэрыялізму

ПАРЫЖ, 9. Паводле паведамленьня «Юманітэ», намдэпутат тав. Кашэн у сваім выступленьні ў парляманце аб зьнешняй палітыцы Францыі адзначыў, што ва ўсіх дэбатах аб зьнешняй палітыцы зараз пануюць два фактары: першы—сусьветны эканамічны крызіс, які абвастрае суперніцтва імпэрыялістаў, адным з эпізодаў якога зьяўляецца аўстра-нямецкая мытная згода, а другі —посьпех пяцігодкі, які сьведчыць аб перавазе плянаванай сацыялістычнай народнай гаспадаркі над капіталістычнай.

Далей тав. Кашэн адзначае нязвычайную глыбіню цяперашняга сусьветнага эканамічнага крызісу і выключныя разьмеры беспрацоўя у капіталістычных краінах. «Асаблівасьць цяперашняга крызісу,—гаворыць далей тав. Кашэн,—заключаецца ў тым, што крызіс перавытворства б'е ня толькі па прамысловасьці, але і па сельскай гаспадарцы, прычым для аграрных краін крызіс зьяўляецца, бадай, больным няшчасьцем, чым для індустрыяльных».

«Ні з якога боку,—гаворыць далей тав. Кашэн,—у рамках капіталістычнай ханкурэнцыі выратаваньня ня відаць і толькі СССР ужывае дзейныя меры супроць хвароб, якія лютуюць ва ўсіх іншых краінах.

Потым тав. Кашэн спыняецца на пляне стварэньня іпатэчных крэдытаў для ўсходніх аграрных краін і адзначае, што сапраўдная мэта Францыі, якая аказвае фінансавую дапамогу дробным аграрным краінам, гэта захаваць гегемонію ў Эўропе ў процівагу Нямеччыне. Падкрэсьліваючы, што Вэрсальскі дагавор лажыць усім цяжарам на працоўных масах Нямеччыны, якія паўстаюць супроць панаваньня іх на поўнага плянам Юнга, тав. Кашэн указвае, што пад кіраўніцтвам сваёй кампартыі шырокія масы Нямеччыны вядуць гэраічную барацьбу супроць уціску дагавораў, гітлераўскай рэакцыі і ўраду Брюнінга.

Тав. Кашэн заяўляе, што «французскі пралетарыят адхіляе палітыку сваёй буржуазіі, якая ўскладае цяжар дагавораў на плечы нямецкіх рабочых, палітыку, якая вядзе проста да вайны».

«Французская кампартыя, — гаворыць тав. Кашэн,—заклікае французскіх рабочых поўнасьцю салідарызавацца з братамі па гадзіны — нямецкімі рабочымі, якім трэба дапамагчы для таго, каб зьнішчыць жабальны плян Юнга і сыстэму ваенных пазык. Ім неабходна дапамагчы і ў барацьбе з нямецкім імпэрыялізмам».

Далей тав. Кашэн падкрэсьлівае, што «шлях да сапраўднага міру—гэта паражэньне імпэрыялістаў, міжнародная рэвалюцыя». У сваёй прамове тав. Кашэн падкрэсьлівае, што зьнешняя палітыка французскага ўраду да гэтага часу зьяўляецца антысавецкай. Найбольшыя намаганьні,—гаворыць тав. Кашэн,—рабіліся і робяцца для згладжваньня супярэчнась

# Плянаваньне--вузкае месца фабрыкі „Прафінтэрн“

**Вялізарны прарыў--вынік наўязкі работы цэхаў і агрэгатаў, адсутнасьці гаспадарчага разрахунку, слабага адзіначальня, непскага кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, ігнараваньня рабочых прапаноў, запяпаду прадпысціплівы, росту прагулаў**

АРГАНІЗАЦЫІ ФАБРЫКІ НЕ СТАЯЦЬ НА ЧАЛЕ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧАЙ МАСЫ

## Пакончыць з апартуністычным самацёкам, да 1 чэрвеня ліквідаваць прарыў

Швейная фабрыка «Прафінтэрн» № 1 пачала 3-ці рашаючы год з вялікім прарывам у выкананьні прамфінпляну амаль па ўсіх паказальніках. Гапебныя лічбы мінулага году не паслужылі ўрокам фабрычным арганізацыям для мабілізацыі рабочай масы на ліквідацыю прарываў і на выкананьне прамфінпляну ў першым квартале г. г.

У першым квартала праграма выкавана толькі на 87,2 проц., сабекошт зьнижан замест 5,46 проц. на 2,47 проц., брак дасягае 3,3 проц., замест 0,3 проц. паводле пляну. Прычым характэрна, што фабрыка была поўнасьцю забясьпечана рабочай сілай, а процант адміністрацыйна-тахнічнага і абслугоўваючага персаналу значна перавышаў плянавыя заданьні (157 на пляну, фактычна 543). Таксама сырцом фабрыка была поўнасьцю забясьпечана.

Яшчэ горшы малюнак паказаў красавік, у якім прарыў яшчэ больш паглыбіўся. Вытворчая праграма выкананa толькі на 80,6 проц. Такім чынам, заканчваючасьць фабрыкі за першыя чатыры месяцы складае: паліто — 31.044, пінжакоў — 3.205, дзіцячых паліто — 13.210 і каля пар 600 штаноў. Сума недавыпрацаванай фабрыкай прадукцыі складае звыш 1 мільёну рублёў.

### Як прафінтэрнаўцы „мабілізуюць“ рэсурсы

Замест сапраўднай мабілізацыі ўпусраных рэсурсаў, на складах і ў цэхах фабрыкі—вялікія залежы гатовай прадукцыі і напфабрыкатаў. Брыгада выявіла па складзе 7.007 гатовых целагрэек і нязкончанай прадукцыі—паліто 10.697 шт., дзіцячых паліто 2.055 шт., пінжакоў гатовых 311 і целагрэек 2.448 шт., усяго на суму 383.623 руб. Гэтыя залежы прынесьлі вялікую шкоду ня толькі ў галіне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, але таксама мелі вялікі ўплыў на зьніжэньне сабекошту. Апрача гэтага, фабрычныя арганізацыі ня ўлічылі важнасьці сваячасовага вырабу гэтай прадукцыі, якая галоўным чынам прызначалася для трактарыстаў-калгасьнікаў і вучняў.

### Рэкорд бясплянавасьці і безгаспадарчасьці

Усе вышэйпералічаныя залежы зьяўляюцца вынікам безгаспадарчай і бясплянавай работы кіраўнікоў фабрыкі і Белшвэйаб'яднаньня. Калі брыгада зацікавілася прычынай нескончэньня прадукцыі, дык высьветлілася, што амаль уся гатовая прадукцыя ня была скончана толькі таму, што адміністрацыя фабрык «Прафінтэрн» і «Сьцяг індустрыялізацыі» (апошняя забясьпечвае «Прафінтэрн» цаўфабрыкатамі) сваячасова не паклапацілася забясьпечыць шоўкам для пятліц апошнія апэрацыі. Калі лепшыя ўдарнікі камуны імя Фабрыцыўса даведаліся аб тым, што з-за недахвату пятліц застанецца ў цэхах вялікая колькасьць нескончанай прадукцыі, яны прапанавалі адміністрацыі часова, да атрыманьня шоўку, працаваць уручную ніткамі (што не пагоршыла-б якасьці прадукцыі), але адміністрацыя гэту каштоўную прапанову адхіліла і ў выніку вось ужо звыш 10 дзён ляжаць мёртвым капіталам каля 11.000 паліто.

Ня ўступае ў галавацяпстве і кіраўніцтва Белшвэйаб'яднаньня. У сярэдніх лічбах сакавіка Белшвэйаб'яднаньне прыслала тэлеграму - маланку аб тэрміновым пераводзе цэху паўпаліто на выраб целагрэек. Шмат часу пайшло на «дыпляматычныя» перагаворы і перапіску паміж аб'яднаньнем і фабрыкай. А калі фабрыка скончыла гэтае заданьне, дык аказалася, што кіраўнікі швэйаб'яднаньня «забыліся» аб сваёй тэлеграме і не далі ніякіх паказаньняў і нарадаў на адгрузку целагрэек. Такім чынам, целагрэйкі, замест тэрміновай адгрузкі іх калгасьнікам-трактарыстам, засталіся ляжаць мёртвым капіталам на фабрыцы.

Да гэтага можна дадаць яшчэ рад фактаў безгаспадарчасьці і бясплянавасьці. Так, 4-га мая ў цэху паліто папсавалася спэцмашына на выметцы края. Гэту машыну можна было адрамантаваць за 10-15 хвілін, але з-за адсутнасьці ў той час механіка машына прастаяла 6 гадзін.

Пяўязка ў рабоце паміж фабрыкай «Сьцяг індустрыялізацыі» і «Прафінтэрн» № 1 увесь час моцна б'е па зьніжэньні сабекошту і павялічвае брак і прастой. 30-га красавіка 40 рабочых цэху паліто прастаялі 3 з пал. гадзіны толькі таму, што закройны цэх фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» даслаў выкладні без падкладачна-прыкладачных матар'ялаў. Наогул трэба адзначыць, што закройны цэх фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» увесь час дасылае выкладні неадпаведныя асартымэнтаў і колераў, што выклікае вельмі частыя перабоі ў рабоце і павялічвае брак.

4-га мая таксама з-за несвачасовай дастаўкі кішэневай падкладкі, адміністрацыя цэху паліто прымушана была перавесьці рабочых на іншую работу, што дрэнна адбілася на прадукцыйнасьці працы.

Пасьля вышэйпаданых фактаў ня будзе дзіўным, чаму фабрыка выплаціла рабочым у першым квартале за прастой 8.786 руб.

### Крывая прагулаў узьнімаецца ўгару

Фабрычны «трыкутнік» дагэтуль не пачаў барацьбы за правядзеньне цьвёрдага адзіначальня і працдысцыпліну. Прагулы з кожным днём павялічваюцца. Калі ў студзені прагулаў на няўважлівых прычынах налічвалася 17, дык люты дае 21, а ў сакавіку лічба прагулаў узрасла да 48. Май дае яшчэ большую колькасьць прагулаў на няўважлівых прычынах. Толькі ў адным паліто-цэху за адзін дзень 3-га мая ня выйшла на работу па няўважлівых прычынах 35 чал.

Лічба спагнаньняў таксама выразна малюе занятад працдысцыпліны. У студзені было 46 спагнаньняў, у лютым —48, а ў сакавіку—82.

Занятад працдысцыпліны тлумачыцца адсутнасьцю адзіначальня і масава-выхаваўчай работы з новымі рабочымі. Грамадзкая думка вакол барацьбы з дэзарганізатарамі працы ня ўзьнята. Чырвоная і чорная дошкі існуюць толькі фармальна.

### У баку ад сапраўднага сацспаборніцтва і ўдарніцтва

З 1800 рабочых фабрыкі ўдарніцтвам ахоплена 1092 чал. Большасьць ударнікаў аб'яднаны ў вытворчыя камуны і ўдарныя брыгады (17 камун і 25 брыгад). Але з-за адсутнасьці належнага кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам ня відаць ніякай эфэктыўнасьці ў рабоце брыгад і камун. Адміністрацыйна-тэхнічны персанал да камун і брыгад не прымацаваны. Эканамічны эфэкт ад работы ўдарных брыгад і камун ня ўлічваецца. Дагаворы на сацспаборніцтва паміж паасобнымі брыгадамі і істужкамі сыстэматычна не правяраюцца.

На запытаньне—якая брыгада ці камуна зьяўляецца больш прыкладнымі, фабком паказаў на камуну імя т. Каган матывуе тым, што рабочыя ня выконваюць існуючых норм і таму ня трэба іх пераглядаць, у той час, як ударнікі значна перавышаюць нормы, прадугледжаныя плянам. Стаўка на «вузкія» месцы! Да 6-га мая на гаспадарчы разрахунак пераведзены толькі два цэхі.

Брыгада моладзі віцебскай швэйнай фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі», якая атрымала прэмію ў 800 руб. за ўдарную работу

### У бой за ліквідацыю прарываў, за выкананьне прамфінпляну

Прарыў можа і павінен быць безадкладна зьліквідаваны. Фабрыка «Прафінтэрн» мае ўсе магчымасьці да выкананьня і перавыкананьня вытворчай праграмы. Аб гэтым зусім выразна сьведчаць творчы ўздым і энтузіязм рабочых фабрыкі. Лепшыя ўдарнікі—гэроі вытворчасьці, як т. т. Гопад, Курноў, Дубінін і інш., паказваюць зусім добрыя прыклады змаганьня за прамфінплян. Гэтыя таварышы на працягу ўсяго часу даюць вельмі каштоўныя прапановы. Тав. Дубінін — старшы мэханік фабрыкі — пераканструяваў швэйныя машыны 16-й клясы ў быстраходныя і арабіў штамп да тамбурных машын, гэтым самым ён вызваліў фабрыку ад завозкі з-за мяжы розных частак да машын.

Гэты творчы ўздым рабочых ёсьць лепшая зарука выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну і калі дагэтуль прамфінплян ня выконваўся, дык выключна па прычыне апартуністычнага кіраўніцтва фабрычных арганізацый, якія ня сталі на чале ўдарніцкага руху. Работа партыйных і прафсаюзных арганізацый фабрыкі перабудавана толькі фармальна. Парт'ячэйкі і цэхкомы не павярнуліся тварам да вытворчасьці, да цэхаў і асобных вучасткаў.

Толькі пры належным бальшавіцкім кіраўніцтве, пры сапраўдным правядзеньні адзіначальня, арганізацыі «сквозных» ударных брыгад, поўным пераходзе фабрыкі на гаспадарчы разрахунак і неадкладным правядзеньні перагляду норм і расцэнак,—пры шырокім удзеле ўсіх рабочых, прарыў будзе ліквідаваны і прамфінплян выкананы.

Брыгада газэт «Зьвязда» і «Віцебскі Пралетары» Арк. Зарубежны. Г. Каган, Б. Канцапольскі і Ляк.

# Месячнік друку і перавыбары рэдкалегій насьценгазэт—

## МАСАВАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАМПАНІЯ

(Ліст гаркомам і райкомам КП(б)Б, рэдакцыям цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт)

З 20-га мая па 20-га чэрвеня на БССР праводзіцца месячнік пралетарскага друку. Асноўныя палітычныя ўстаноўкі месячніка даны ў пастанове Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, якая надрукавана ў газэце «Зьвязда» ад 6 мая.

Для практычнага ажыцьцяўленьня пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б неабходна:

а) На адкрытых сходах партыйных ячэек заслухаць 1) даклад аб пастановах ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, аб перабудове рабселькораўскага руху, аб сельскім, раённым і нізавым друку і аб месячніку друку. Асноўны ўпор у гэтых дакладах неабходна зрабіць на пытаньні перабудовы рабселькораўскага руху і забясьпячэньні штодзённага канкрэтнага кіраўніцтва ім. 2) Даклад рэдкалегіі насьценнай або шматтыражнай газэты (не даклад аб усёй рабоце, а па адным канкрэтным пытаньні): «Газэта і барацьба за сяўбу, за калектывізацыю і арганізацыю працы ў калгасах, а таксама работа з селькорамі»—для вясковых газэт і «Барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, аўладаньне тэхнікай, за зьніжэньне і гаспадарчы разрахунак, а таксама работа з рабкорамі» (для фабрычна-заводзкіх газэт). Даклад рэдкалегіі павінен быць шчыльна ўвязаны з пытаньнямі канкрэтных мерапрыемстваў на падрыхтоўцы да надыходзячага Усебеларускага зьезду рабселькораў і ў прыватнасьці з папулярызацыяй і забясьпячэньнем практычнага выкананьня тых канкрэтных самаабавязацельстваў у галіне друку, якія ўзяты гэтай насьценгазэтай у сувязі з лістом менскіх ударнікаў друку (ліст, надрукаваны ў газэце «Зьвязда» ад 6 мая). 3) Даклад упаўнаважанага на друку аб распаўсюджаньні друку на поўным прадпрыемстве, калгасе і г. д. і аб мерапрыемствах на павялічэньні распаўсюджаньня друку.

б) Правесьці праверку выкананьня ўсіх раней прынятых ГК, РК і ячэйкамі пастаноў па пытаньнях нізавога друку і рабселькораўскага руху, а таксама таго, як ажыцьцяўляюцца дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па друку. Праверку злучыць з апарацыйнай работай па ажыцьцяўленьні тых пунктаў пастаноў, якія да гэтага часу ня выкананы.

в) У раёнах і гарадох арганізаваць агульна - раённыя і гарадзкія тэматычныя конкурсныя выстаўкі насьценных і шматтыражных газэт, а таксама тэматычныя кніжныя выстаўкі (літаратура па аўладаньні тэхнікай і г. д.) Лепшыя насьценныя газэты трэба прэміяваць і не пазьней 3 чэрвеня прыслаць у Менск для Усебеларускай выстаўкі нізавога і раённага друку.

г) Дзень друку па БССР—20 мая—усе газэты аднаўзаюць спэцыяльнымі нумарамі газэт. На працягу месячніка пралетарскага друку—з 20 мая па 20 чэрвеня—неабходна сыстэматычна зьмяшчаць адделы, прысьвечаныя пытаньням месячніка, вылучыўшы для вядзеньня аддзелу спэцыяльнага работніка.

д) Агляды друку павінны зьвяцца сустаўной часткай кожнага нумару цэнтральнай, гарадзкой, раённай і шматтыражнай газэты. Гэтым аглядам Культпроп ЦК КП(б)Б надае важнейшае значэньне ў справе забясьпячэньня парыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам. Агляды друку па сваім значэньні павінны прыраўноўвацца да перадавых рэдакцыйных артыкулаў.

ж) Сустаўной часткай месячніка друку павінна зьвяцца работа па ўзмацненьні масавай работы вакол яшчэ большага ўзмацненьня распаўсюджваньня пралетарскай кнігі як на беларускай мове, гэтак і на мове нацыянальнасьцей. Адначасова ў часе месячніка неабходна зрабіць праверку зьместу бібліятэк, зьняўшы ўсю шкодную нацыянал-дэмакратычную літаратуру.

з) Распачаць вярбоўку лепшых рабселькораў - ударнікаў і непасрэдна партыйных работнікаў у надыходзячыя паборы на газэтныя аддзяленьні Камвузу імя Леніна, усебеларускай сацпартшколы, усебеларускага політасьветнага тэхнікуму.

і) Закончыць і падвесьці рынкі масавага агляду-самаправеркі работы нізавога друку, становішча рабселькораўскага руху і партпрацы ў ім. Вынікі абазвіжова павінны быць абгаворваны на бюро ячэек, пэрыкалектываў і РК КП(б)Б.

к) Для выбараў дэлегатаў на Усебеларускі зьезд рабселькораў на больш буйных прадпрыемствах, калгасах, саўгасах, МТС (канкрэтны сьпіс гэтых пунктаў будзе дадаткова апублікаван аргкамісіяй па скліканьні зьезду)—непасрэдна скліканя сходы ўнутрызаводзкія, калгасныя і г. д. зьлёты рабселькораў. Іншыя рабселькоры, выбіраюць дэлегатаў на агульна-гарадзкіх або раённых зьлётах.

Колькасьць выбіраных дэлегатаў і парадак выбараў паведаміць дадаткова, устанаўляецца аркамісіяй. Зьлёты павінны быць праведзены ў часе паміж 20 мая (для гарадоў) і 30 мая (для сельскіх раёнаў).

Паводле атрыманых ЦК КП(б)Б лістах, у радзе асобных партыйных арганізацый не скалцэнтравана патрэбная ўвага да абвешчанай пастановай Сакратарыяту ЦК КП(б)Б усебеларускай масавай палітычнай кампаніі перавыбараў рэдкалегій насьценных газэт.

Перавыбары рэдкалегій павінны забясьпечыць ператварэньне брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху, узмацненьне ролі рабселькораўскага руху, як актыўнага правадніка генеральнай лініі партыі. Ні ў якім разе нельга забываць аб рабоце з рабселькорамі - адзінокімі, якіх неабходна ўцягваць на ўдарныя брыгады друку.

У рэдкалегіі насьценных газэт павінны выбірацца лепшыя ўдарнікі, адданыя змагары за ажыцьцяўленьне генеральнай лініі партыі.

Культпроп ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу цэнтральных газэт і фабрычна-заводзкіх друкаваных шматтыражак БССР на недапушчальна неадвальнае шматлікае цэнтральнымі газэтамі і шматтыражкамі пастановы ЦК КП(б)Б аб сыстэматычным і шырокім асьвятленьні на старонках газэт масавага агляду-самаправеркі нізавога друку, перавыбараў рэдкалегій і падрыхтоўкі да Усебеларускага зьезду рабселькораў.

Загадчык Культпропам ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Загадчык сэктарам друку Культпропу ЦК КП(б)Б КУРЦІК.

*Бульбу—прамысловым цэнтрам*

## 21.000 ТОН НАСЕННАЙ БУЛЬБЫ

# АДГРУЗІЦЬ ДА 15 МАЯ

**Сёнешнія тэмпы адгрузкі тармозяць пасеўную кампанію ў Ленінградзкай вобласьці і Украіне**

### ДАВОЛІ САМАСТРАХОЎКІ

БССР да бягучай пасеўкампаніі павінна адгрузіць насенную бульбы: Украіне 3.000 тон і Ленінградзкай вобласьці 18.000 тон. Усяго 21.000 тон, або 1.400 вагонаў. Поўнае выкананьне пляну адгрузкі дасьць магчымасьць выканаць пасеўныя пляны Украіны і Ленінградзкай вобласьці. Гэта таксама дасьць вялікую эканомію ў галіне транспарту, бо, калі зараз ня будзе выкананы плян адгрузкі, дык увосень прыйдзецца адгрузіць у 10 раз больш, на што будзе патрэбна 14.000 вагонаў. Адгрузка насенной бульбы мае таксама вялізарнае значэньне для пасьпяховага выкананьня пасеўных пляноў у прыгарадных гаспадарках прамысловых цэнтрах. Вось чаму пралетарская і працоўная грамадзкасьць БССР павінна мабілізаваць усе сілы на выкананьне пляноў адгрузкі.

На сёнешні дзень тэмпы адгрузкі зусім нездавальняючыя. Паводле даных на 7 мая, Украіне было адгружана 1.450 тон, або 45,5%, Ленінградзкай вобласьці — 730 тон (3,9%). Між тым паводле пляну бульбы Украіне ўжо павінна была быць адгружана поўнасьцю і Ленінградзкай вобласьці не менш 60%.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі на мясцох праяўляюць недапушчальную бязьдзейнасьць у адгрузцы бульбы. Раней раённыя арганізацыі спасылаліся на розныя аб'ектыўныя прычыны (мароз, паводка і г. д.), а зараз яны проста нічога ня робяць.

Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак не спагнаны. У Хойніцкім раёне загатоўчыя арганізацыі нават ня ведаюць, як выконваць кулакі цьвёрдыя заданьні.

У пасёлку Мансеў (Уваравіцкі раён) пад носам у партыйных і савецкіх арганізацый кулакі вядуць шалёную агітацыю супроць адгрузкі бульбы. У Вацуніцкім сельсавеце кулакоў аштрафавалі за невыкананьне цьвёрдых заданьняў, але ўжо прайшло тры месяцы і кулакі ня толькі ня выканалі яшчэ цьвёрдых заданьняў, але і не заплацілі штрафу. Сельсавет адносіцца прымірэнча да кулакоў і не прымушае іх выканаць заданьні.

Некалькі слоў аб кіраўніцтве адгрузкай бульбы з боку Белсадгароднінны. На сёнешні дзень Белсадгародніна ня ведае, у якім раёне і колькі рэальна можна загатовіць бульбы. Белсадгародніна абмяжоўваецца выключна сухімі дырэктывамі раёнам, прычым дырэктывы даюцца бяз уліку і без праверкі выкананьня. Адказны выканаўца па бульбе тав. Прэабражэнскі замест баявой работы, замест жывога інструктажу, сыстэматычнага кіраўніцтва адгрузкай, страхуе сабе шматлікімі тэлеграмамі, адносінамі, дырэктывамі і г. д.

Дырэктар Белсадгароднінны тав. Цофін таксама ня прыняў меры для мабілізацыі нізавой сыстэмы і свайго цэнтральнага апарату вакол загатовак і адгрузкі бульбы. 16 раённых кантор Белсадгароднінны фактычна бязьдзейнічаюць. Даволі сказаць, што Белсадгародніна ня ножа атрымаць ад сваіх кантор дакладных вестак аб ходзе загатовак і адгрузкі.

Неабходна зараз-жа дабіцца карэннага зруху ў ходзе адгрузкі бульбы. Раённыя арганізацыі і цэнтральны загатоўчы апарат павінны пераключыцца на баявыя, сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. Цьвёрдыя заданьні з кулакоў павінны быць неадкладна спагнаны поўнасьцю. Кулакоў, якія злосна ігнаруюць выкананьне цьвёрдых заданьняў, трэба прыцягнуць да судовай адказнасьці.

П. Сьпірын.

### „Вы падзякуеце, калі адгрузім вам да 20 мая“

**Паводле заключанага дагавору, Белсадгародніна павінна адгрузіць Украіне 3.000 тон насеннай бульбы. На гледзячы на нязначны плян вывазу, Белсадгародніна сыстэматычна ня выконвае дагавору. Учора скончыўся трэці ўстаноўлены дагаворам канчатковы тэрмін адгрузкі. Калі парушэньне ўстаноўленага ўрадам тэрміну адгрузкі—25 красавіка—прайшоў для загатоўшчыкаў пакуль што беспакарана, дык за парушэньне апошняга тэрміну, прадугледжанага дагаворам, Белсадгародніна плаціць Украіне няўстойку. Такім чынам, бязьдзейнасьць загатоўчых арганізацый б'е па іх-жа саміх. Гаспадарчы разрахунак зьяўляецца лепшым інструктарам бязьдзейнасьці Белсадгароднінны. На сёнешні дзень Украіне адгружана толькі 1.450 тон бульбы. За 1.550 тон Белсадгародніна плаціць няўстойку.**

**Аднак кіраўнікі загатоўчых арганізацый мала клапоцяцца аб уніканьні матар'яльных страт. Так, адказны работнік Белільнасаюзу тав. БАРШАЙ замест таго, каб ужыць тэрміновыя меры для фарсаваньня адгрузкі бульбы зьвяжу прадстаўніку Украіны: «Вы падзякуйце, калі мы вам адгрузім бульбу да 20 мая».**

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца гэтай справай.

МІРКІН.

### Поўная бязьдзейнасьць

**БЯЛЫНІЧЫ.** (Наш кар.).

Бялыніцкі раён да гэтага часу выкапаў толькі пекальні процантаў свайго веснавога пляну адгрузкі бульбы. Ня гледзячы на шматлікія дырэктывы партыі і ўраду, бялыніцкія раённыя арганізацыі ня ўжываюць ніякіх мер для ўзмацненьня адгрузкі. Райвыканком і райспажыўсаюз пасылаюць сельсаветам шмат сухіх дырэктыў, але амаль ніколі не правяраюць як гэтыя дырэктывы выконваюцца.

Раённыя кіруючыя арганізацыі ня высылаюць сваіх прадстаўнікоў на месцы для ліквідацыі прарыву ў адгрузцы.

Трэба зараз-жа ўжыць рашучыя меры для забясьпячэньня выкананьня пляну адгрузкі.

Брыгадзір.

### „Тэмпы“ пракуратуры рэспублікі

22 красавіка Наркамснаб БССР накіраваў у пракуратуру рэспублікі матар'ял для прыцягненьня да адказнасьці старшынь райвыканкомаў, райспажыўсаюзаў і райспабаў Пэрыцкага, Чэрыкаўскага і Чавускага раёнаў за злачынную бязьдзейнасьць у выкананьні пляноў адгрузкі бульбы прамысловым цэнтрам. Гэтыя раёны сьведома ня выканалі дырэктывы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў аб фарсаваньні адгрузкі бульбы. На 22-IV гэтыя раёны не адгрузілі прамысловым цэнтрам ні аднаго кіло бульбы. На 5 мая Чэрыкаўскі раён замест вызначаных пляном 1.550 тон адгрузіў толькі 60 тон, Пэрыцкі замест 3.292, адгрузіў 76 тон, Чавускі раён і да гэтага часу зусім не прыступіў да адгрузкі.

Як-жа рэагавала пракуратура рэспублікі на гэтыя агідныя факты? Замест таго, каб у тэрміновым парадку разгледзець гэту справу, пракуратура прамрыкнавала яе з 22 красавіка аж да 5 мая і толькі 6 мая тав. Мар'ясіна надаслала рэзалюцыю аб накіраваньні справы вучастковым пракурорам на расьсьледваньне. Здавалася-б, што цягаліне ўжо наступіў канец. Адзак, справа праляжала яшчэ тры дні ў стале сакратара і толькі 8 мая была накіравана ў раёны.

Гэты факт сьведчыць аб недапушчальна марудным рэагаваньні пракуратуры рэспублікі на невыкананьне дырэктыў партыі і ўраду.

Такія адносіны ня толькі не дапамагаюць выкананьню пляноў адгрузкі бульбы, але ніадварот тармозяць гэту важнейшую справу.

Юрка К-ч.

# У баёх за калгасы

(З дарожных нататак).

М. Зарэцкі разам з былым наркамзэмам нацдэмам Прышчэпавым зрабіў «падарожжа на новую зямлю». Прыехаўшы на Мар'інскія балоты М. Зарэцкі заўважыў, што нам не хапае «дацкай культуры» зямляробства, г. зн. культуры капіталістычнай фармы, з яе прыгодамі эксплёатацыі. Ён зрабіў фантастычнае падарожжа на нацыянал-дэмакратычную зямлю і зусім не заўважыў, як ужо ў той час у бязьлітаснай барацьбе з кулаком, сапраўдным беларускім кулаком, які пад прыкрышцём хлусьні контр-рэвалюцыйных нацдэмаў аб «адзінай беларускай нацыі», вёў шалёную барацьбу супроць беднаты, серадняцтва і мерапрыемстваў савецкай улады, групаваліся сілы біднякоў-серадняцкай вёскі для рашучага ўдару па старых мэтадах гаспадараньня. Там сапраўды шырока разгарнулася барацьба за новую зямлю. Але не за дацкую культуру капіталістычнай эксплёатацыі у сельскай гаспадарцы ідзе змаганьне, а за самы перадавы ў сьвеце тып гаспадараньня — за буйныя сацыялістычныя гаспадаркі. У рух прыйшлі шматмільённыя масы беднякоў і сераднякоў. Новыя людзі, прайшоўшыя школу актыўнай савецкай работы, становяцца на чале гэтага руху, арганізоўваюць яго.

Падарожнічаць вараз вельмі цікава і надта выдзіўляе тое, што некаторыя «скучаючые» пісьменьнікі і паэты «сумуюць» аб абмежаванасьці творчай тэмы, аб тым, што няма натхненьня пісаць аб парастках новага жыцьця «на спэцыяльным заказе». Адно падарожжа па вёсках дае столькі цікавага, арыгінальнага матар'ялу для творчай работы, для паказу ў мастацкай форме барацьбы клас, барацьбы старога з новым, што ня хочацца вершыць дыспутам аб «натхненьні», ня хочацца чуць аб «абмежаванасьці» тэмы і аб іншых «абмежаванасьцях», якія выцякаюць з таго, што рад пісьменьнікаў і паэтаў свой просты адыход ад актыўнай, творчай работы на сацыялістычным будаўніцтве імкнуцца замаскаваць «натхненьнем» і «абмежаванасьцю». Мы ўжо не гаворым пра фабрыкі і заводы, дзе выбар тэмы літаратыра не абмежаваны, дзе кожны новы дзень прыносіць новыя ўзоры гэрэічнай барацьбы рабочых на фронце індустрыялізацыі.

Падарожжа па Капаткевіцкім раёне (быв. Мазырскай акругі) выяўляе, што кулак у перадсьмяротнай бойцы з наступаючымі калгаснымі калёнамі «выкручваецца, як галюка», імкнецца затрымаць рух беднякоў і сераднякоў за калгасы. У раёне ёсьць тры вёскі (Пілішавічы, Валошычы і Навасёлкі), дзе і да гэтага часу маем шмат прыкладаў кулацкага «выкручваньня», уменьня хітра парыраваць нашы ўдары і арганізаваць «прапрапоўку» пастаноў зьезду і чарговых кампаній на сваім гусьце. У гэтых трох вёсках няма ні ячэек і нават паасобных партыйцаў.

Наш дакладчык з налёту наяжджае на сход раз, або два у месяц, а кулак працуе ўвесь час і застацца камэнтатарам вынікаў сходу да наступнага пэрыяду. Можна ўявіць сабе карысьць такіх гастралёрскіх мэтадаў агітацыі.

Мы падамо некалькі прыкладаў кулацкай агітацыі, кулацкай работы супроць весьнавой сяўбы, калектывізацыі і загатоўчых кампаній. Адным з цэнтральных месц зараз зьяўляецца стваральнае насеннае фондаў да весьнавой сяўбы. Гэта работа праходзіць на сотні разоў вельмі марудна, асабліва па аднаасобным сэктарам.

Кулак проста зьяўзвае падрыхт ўку да весьнавой сяўбы са абвешчаннем гамі і вядзе шалёную кампанію, каб ніякіх фондаў не стварыць і насеньня не ачышчаць.

Партыйная арганізацыя ня здолела супроць паставіць сваячасова гэтым кулацкім мануўрам разгорнутай партыйна-масавай работы і цяпер ёй прыходзіцца несьці «накладныя выдаткі» за начучласьць да хітрыкаў клясавага ворага. Кулацкі спосаб уязьдзейнічаць на арыў мабілізацыі сродкаў насельніцтва заключаецца ў тым-жа. «Ня купляйце цукру па камэрцыйнай цане, бо гэта створана спэцыяльна, каб выкрыць ваша мэемаснае становішча і абклясьці індывідуальным падаткам». І шмат хто з аднаасобнікаў адразу спыніў купляць цукар.

Асабліва жорстка і без разбору мэтадаў кулацтва змагаецца супроць калгаснага руху. Сапраўды для барацьбы супроць калгасу ў кулака «ўсе сродкі добрыя». Пасьля працэсу над «прампартыяй», кулакі пусьцілі ня раёне чуткі аб тым, што працэс над «прамысловай партыяй» ужо быў, а цяпер будуць судзіць тых, хто праводзіць калектывізацыю, г. зн. будзе асуджана «калгасная партыя».

Для зазрыманьня калгаснага руху кулацтва ідзе на ўсякія выдумкі. У вёсцы Пілішаўка, на сходзе сялян 5-IV—31 году выступіў адзін падкулачнік з каментаваньнем Леніна, яго думак аб калектывізацыі. Ён узяўся даводзіць сялянам неабгрунтаванасьць сучаснай палітыкі партыі і супроцьстаўляў палітыку калектывізацыі палітыцы Леніна. Вось, што казаў гэты кулацкі падпявала: «Ленін гаварыў, што ён пабудуе сацыялізм за 50-60 год і ўцягне ўсіх сялян у калгасы, а вы са сваёй пяцігодкай за чатыры гады і калектывізацыяй на працягу гэтага часу паступаеце не па-ленінску». Вядомае ленінскае палажэньне аб тым, што 10-20 год правільных узаемадносін з працоўным сялянствам і перамога сацыялізму будзе забясьпечана, падкулачнік перакручіў самым нахабным чынам. Асабліва пашанай кулакоў карыстаюцца два спосабы работы. Першы — пагроза вайны і другі — пагроза простай расправы з людзьмі, якія ідуць у калгасы. Чуткі аб вайне шырока распаўсюджаны. Кулакі кажуць: «вось будзе вайна і тады ўсіх калгасьнікаў перавешаюць», ці «ўжо нарыхтавалі спэцыяльныя пачэпкі для таго, каб адзначыць імі ўсіх калгасьнікаў, як у часе прыгону адзначалі сялян». Нават на подкуп ідуць кулакі, абы толькі пашкодзіць калектывізацыі. Вядомы выпадкі, калі кулакі давалі «хабар» асобным бяднячкам і прымушалі іх адмовіцца ад уступленьня ў калгас.

Паасобныя камуністы на фоне жорсткага супраціўленьня клясавага ворага саступістычнаму наступленьню апускаюць рукі і заяўляюць: «справа з калектывізацыяй у нашым раёне стаіць дрэнна і мы не пасуемся наперад». Яны, сустракаючыся з труднасьцямі барацьбы за калгасны прыліў, сьхільны злажыць зброю і чакаць, пакуль у другіх мясцох БССР ня будзе скончана суцэльная калектывізацыя і цяперашнія ўпартыя «нехаціцы» будуць акружаны калгасамі і здадуцца. Гэта апартуністычны антыпартыйны шлях. Мы павінны ва ўпартай барацьбе ламаць супраціўленьне клясавага ворага і перш за ўсё нам трэба павысіць і палепшыць мэтады нашай масавай работы. Мы павінны перайсьці ад гастраляваньня раённых работнікаў на вясковых сходах, да сталай работы, да таго, каб пасьлядць пару дзён у вёсцы, выкрыць манэўры кулака, вынучыць актыў, арганізаваць яго і абаперціся ў сваёй рабоце. Кажу некаторыя прыклады: «Для таго, каб [illegible] трэба ведаць яго сілы, [illegible] на-масавай рабоце [illegible] захоўвае сваю сілу.

Яшчэ адзін прыклад з кулацкага арсэналу. Колькі разы работнік у сельсавеце, калгасе і іншых вясковых установах абазначэна будзе рэкамэндаванымі кулакамі шырокім масам сялянства прапаршчыкам, эфэндэрам, сынам абшарніка, сынам фабрыканта і г. д. у залежнасьці ад узросту і падворнага выгляду. Дакага работніка, гэта спэцыяльны спосаб кампрамэтацыі работнікаў у мэтах падрыву іх аўтарытэту і давер'я бяднякоў-серадняцкага сялянства да савецкай улады і партыі.

Цяпер спэцыяльна аб вёсцы Пілішаўка, дзе найбольш моцна пакуль-што акапаўся кулак і дзе мы яшчэ і дагэтуль адчуваем водгукі левых перагібаў мінулага году.

Пілішаўка—вёска серадняцка-бядняцкая. У ёй большасьць складаюць сераднякі. З сотні двароў толькі 7 маюць цьвёрдае заданьне па загатоўках. Пілішаўка пакуль-што ня мае ніводнага камуніста, камсамольца, або калгасьніка, ці нават ініцыятыўную групу. Там кулакі развілі вельмі энэргічную работу, каб ня пусьціць беднаты і сераднякоў у калгас. Найбольш радыкальным мэтадам узьдзейнасьці яны выбралі рэлігію. У мінулым годзе перагібчыкі так загнулі, што арганізавалі «кавалерыйскі атрад» і біз усякага запытаньня ў насельніцтва закрылі царкву. Царква была вернута назад, але ж толькі гэта добра памятаюць і нават ня так даўно кулакі арганізавалі «сьвяткаваньне галавіны зваротку царквы ад «левых» перагібчыкаў і галавадзяцаў». Да гэтай справы яны здолелі далучыць частку беднякоў і сераднякоў, асабліва жанчын.

Кулак тут агаўзаўся вельмі моцна і перад кожным сходам, у залежнасьці ад парадку дня, выпрацоўвае тактыку сваіх паводзін і расстаўляе сілы падкулачнікаў, каму аб чым гаварыць. Каму врываць сход і г. д. У Пілішаўцы — ёсьць хата, якую ўсе завуць РВК. Там падкулачнік Кукса зьбірае сваіх людзей і пад выглядам гульні ў карты вядзе апрацоўку, мае агентуру, выбірае розныя весткі і палохае беднякоў і сераднякоў, якія жадаюць ісьці ў калгас. І падавычай хітра маскуе свой кулацкі твар. Як-жа вядуць сябе падкулачнікі на сходзе і да якіх спосабаў яны даходзяць, каб сарваць сход, або аслабіць значэньне нашай агітацыі?

Найбольш улюбёным мэтадам ліцыцца лёзьнічаньць да калгаснага руху. Напрыклад, выступае падкулачнік і заяўляе: «Я [illegible] што савецкая ўлада [illegible] правільную палітыку, але хутка будзе [illegible] і мы ў калгасы ня пойдзем. [illegible] калі бачыць, што ім [illegible] вырываецца, пачынаецца [illegible] і працягны кашаль, каб ня даць гаварыць дакладчыку і сваім супраціўнікам і гэтым сарваць сход.

Жанчыну-сялянку к

# Змагаючыся за баявыя тэмпы сяўбы,

# РЫХТАВАЦЦА ДА УБОРКІ УРАДЖАЮ

## ЛІКВІДАВАЦЬ НЕПАЛАДКІ, ШТО СТАЯЦЬ НА ШЛЯХУ ПАСЕЎНАЙ

### Разгрузіць склады ад залежаў насеньня і сельска-гаспадарчых машын, забясьпечыць трактары гаручым

## РАЦЫЯНАЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ

Белкалгаспцэнтрам распрацован пастаянны плян уборкі ўраджаю 1931 году, які зацьверджан 8 мая і ўжо спускаецца да раёнаў.

Асабліваю ўвагу ў гэтым годзе зьвернута на машынную ўборку ўраджаю. Усяго ёсьць у калгасах, не ахопленых МТС (Трактарацэнтр складае свой асобны плян), жнівярак-самаськідак 1.602; павінна быць завсэена, паводле пляну, 1.577, ужо завесена 877. Усяго на час уборкі павінна быць 3.179 жнівярак-самаськідак. Такая налічваецьць жнівярак, улічваючы нагрузку на кожную машыну па 6 гэкт., ахопіць 70 проц. усяго ўраджаю збожжавых культур гэтага году.

Сенакасілак ёсьць 287. Плян завозу складае 1.421, з якіх ужо завесена 849. Сяго касілак будзе працаваць 1.708 штук. Машынная касьба ахопіць 80 проц., нагрузка на касілку — 4 гэкт.

Патрэбна сваячасова напомніць, што ёсьць наўмыснае разьмеркаваньне уборачных машын па калгасах. У некаторых калгасах ёсьць па некалькі уборачных машын і пры поўнай дзённай нагрузцы гэтыя машыны будуць нацалову гуляць, а ў іншых калгасах прыдзецца збіраць увесь ураджай ручным спосабам. Прыкладна, адна касілка прыходзіцца на 3 калгасы і адна жнівярка — на 2 калгасы. Для таго, каб даць поўную нагрузку жнівяркам і касілкам, неабходна загадзя распрацаваць плян перакідкі гэтых машын з адных калгасаў, дзе ёсьць лішнія машыны, у тыя калгасы, дзе гэтых машын не хапае. Тым самым будзе роўнамерна раскладзена нагрузка на гэтыя машыны па працягу ўсяго ўборачнага сэзону.

Райкалгасаюзы, калгасы павінны зараз-жа прыступіць да арганізацыі працоўнай сілы на час уборкі ўраджаю. Праца павінна арганізоўвацца на аснове шырокага ўжываньня норм выпрацоўкі брыгад і ўсебаковага ўжываньня выдзельчыны. Уборачная брыгада адказвае за ўборку ўраджаю. І таму склад рабочых уборачнай брыгады павінен быць пастаянны на ўвесь час уборкі.

Вызначаны цьвёрдыя каляндарныя тэрміны ўборкі паасобных культур, выходячы з тэрмінаў, даных у пастанове СНК ад 29 красавіка г. г.

Трэба адзначыць марудназьць работы органаў забесьпячэньня, якія да гэтага часу ня выканалі пляну завозкі неабходных машын у калгасы.

## „Чаго сьпяшацца...“

### —так разважаюць апартуністы з Трактарацэнтру

*Белтрактарацэнтр ня лічыць патрэбным сваячасова рыхтавацца да ўборачнай*

СНК выпес 29 красавіка 1931 году пастанову аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і доглядзе пасеваў. Гэта пастанова дае цьвёрдыя тэрміны давяньня пляну да калгасаў і саўгасаў.

Трактарацэнтр праз сетку МТС будзе ў гэтым годзе праводзіць уборку ўраджаю ў калгасах. Ня гледзячы на тое, што ўжо прайшоў даволі значны час ад выданьня пастановы, Трактарацэнтр яшчэ ня склаў канкрэтнага пляну ўборачнай кампаніі. З дні на дзень зацьвярджаўся плян Белкалгаспцэнтру па ўборцы ўраджаю1931 году, разам з якім павінен быў зацьвярджацца і плян Трактарацэнтру.

Трактарацэнтр недапушчальна адносіцца да гэтай важнейшай справы па складаньні пляну ўборкі ўраджаю, праяўляючы самы сапраўдны правы апартунізм на практыцы. Інспэктар-плянавік Сьцяпура заявіў: «Чаго сьпяшацца, яшчэ ўборка ня скора, друкаваць яшчэ рана і непатрэбна» і абяцаў, што скора складзе плян, а калі — невядома.

Права-апартуністычная бязьдзейнасьць Трактарацэнтру назбаўляе кіраўніцтва МТС — гэтымі апорнымі пунктамі калектывізацыі.

Сваячасовы завоз прычэпнага інвэнтару, рамонт інвэнтару, які ёсьць, арганізацыя працы ў калгасах на час уборкі, далейшае разгортваньне калектывізацыі — вось тыя задачы Трактарацэнтру, якіх ён ня хоча прызнаваць.

Спасылка на самацёк ставіць пад пагрозу справу пасьпяховай уборкі ўраджаю ў калгасах, якія абслугоўваюцца МТС.

Мы б'ем трывогу — Трактарацэнтр ня рыхтуецца па-бальшавіцку да ўборкі ўраджаю 1931 году. Няхай гэтым пытаньнем зацікавяцца тыя арганізацыі, якія павінны паказаць Трактарацэнтру на яго недапушчальную бязьдзейнасьць у гэтай адказнейшай справе.

**П. Арцельны.**

Жаночая брыгада за кармленьнем сьвіней

## З пасеўнага фронту

**Па Белсаўгастрэсьце** па 5-га мая сяўбу распачалі 24 саўгасы. На 5 мая засеяна 197 гэкт., з якіх 61 гэкт. аўса, 56 гэкт. вікі, 15 гэкт. бульбы і г. д.

Па саўгасах Насеннаводсаюзу засеяна 147 гэкт. лубіну.

***

ПОЛАЦАК. (Па тэлеграфу). Усе калгасы раёну выехалі ў поле. Калгасы прыступаюць да пасеву бульбы і іншых культур. Распачата сяўба 1 на індывідуальным сэктары.

***

ВАЛЫНЦЫ. (Па тэлеграфу). На 5 мая ў калгасах засеяна 365 гэкт. канюшыны, 10 гэкт. ячменю, 15 гэкт. гароху і 4 гэкт. гародніны.

***

КРУГЛАЕ. (Па тэлеграфу). На 5-га мая ўзарана калгасамі 1.500 гэкт., аднаасобнікамі — 2.000 гэкт. Сяўба ў поўным разгары.

***

КАРМЫ. (Па тэлеграфу). На 5 мая калгасамі ўзарана 670 гэкт., аднаасобнікамі—269. Засеяна яравых культур: пшаніцы калгасамі — 1 гэкт., аўса — 27, ячменю — 26, вікі — 5 і бульбы — 10 гэкт. Аднаасобнікамі засеяна 36 гэкт. розных культур.

***

ВЕТКА. (Па тэлеграфу). Засеяна калгасамі: аўса — 54 гэкт., ячменю — 44, сарадэлі і вікі — 13, проса — 2 гэкт. Саўгасамі засеяна 270 гэкт. аўса, лубіну і вікі. Аднаасобнікі таксама распачалі сяўбу.

## У МАЗЫРЫ МАРЫНУЮЦЬ КРЭДЫТЫ І НАСЕНЬНЕ

*Прыцягнуць зрыўшчыкаў пасеўнай да адказнасьці*

**МАЗЫР.** (Наш кар.). Сяўба, якая пачалася ў раёне, вылявіла недахват у насеньні амаль па ўсіх культурах. У тойжа самы час на складах райкаапсаюзу ляжаць нерэалізаваныя вялікія запасы насеньня. Ячменю ляжыць каля 5.180 пд., грэчкі—24.510 кгр., фасолі—800 кгр., буракоў—300 кгр. і г. д.

Прычынай затрыманьня насеньня на складах зьяўляецца тое, што райбанк затрымлівае выдачу авансаў калгасам. Вызначаныя крэдыты ў суме 24 тыс. рублоў для атрыманьня насеньня амаль зусім не скарыстаны і не раздаюцца калгасам.

## За 20 дзён скончыць сяўбу

### узяла на сябе абавязацельства Горацкая МТС

**ГОРКІ.** Горацкая МТС уступіла ў бальшавіцкую сяўбу. Увесь раён разьбіт на 5 вучасткаў. МТС мяркуе на працягу 20 дзён поўнасьцю скончыць сяўбу па раёне. Усе трактарысты пераведзены на зьдзельшчыну і ўведзена спаранная язда. Плян веснавой сяўбы і рабочыя вытворчыя пляны даведзены да кожнага трактарыста.

МТС заключаны ўмовы з 73 калгасамі на засеў плошчы ў 9.213 гэктараў, у тым ліку ільну на плошчы 2.165 гэктараў. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, поўнасьцю пераведзены на зьдзельшчыну.

Для лепшага абслугоўваньня трактарных калён пры МТС арганізаваны брыгады разьязных мэханікаў і абсталявана ў раённым цэнтры майстэрня.

Побач з гэтым ёсьць рад недахопаў у рабоце МТС. Так, поўная незабясьпечанасьць гаручым.

З боку райкалгасаюзу наглядаюцца імкненьні да скарачэньня пляну пасеваў тэхнічных культур. Так, у калгасе Нешкава плошча пад ільном скарочана на 10 гэктараў, у калгасе «Маяк»—на 18 гэктараў, калгасе «Кастрычніцкая рэвалюцыя» пасеў ільну зусім зьнят з пляну сяўбы.

Тэхнічны пэрсанал трактарыстаў абвяшчае сябе ўдарным і заключыў паміж сабою ўмовы па сацпаборніцтве. Вызначан спэцыяльны фонд прэміяваньня лепшых ударнікаў у суме 1.000 руб.

**Рахлін.**

Абведнесьнае перцавых плянтацый

## Пытаем Насеннаводсаюз

*Калі-ж будзе выканана пастанова НКЗБ*

Ільнаводзтва ў БССР набывае асаблівае важнае значэньне. Кожны год паширяюцца плошчы пасеву ільну. Значная частка раёнаў атрымлівае спэцыялізаваны ільнаводчы напрамак. Усё гэта, зразумела, ставіць задачу аб арганізацыі насеннаводчай справы.

Усім вядома, што гатункоўнае палепшанае насеньне ільну спрыяе павялічэньню ўраджайнасьці, узрымае якасьць прадукцыі валакна.

Між тым, да апошняга часу гэтай важнейшай справе амаль не аддавалася ніякай увагі і насеннымі ільнаводствам ніхто не займаўся.

30 красавіка калегія Наркамзему абавязала Белкалгаспасэнсаюз арганізаваць у Лёзьнянскім і Сураскім раёнах гадавальнік ільнасемя. Да 5 мая павінны былі быць вылучаны адказныя працаўнікі для арганізацыі гэтай справы. На працягу мая павінен быць складзен плян гадавальніка на 31 год і прыняты меры для разьвіцьця насеннаводнай справы ў гэтых раёнах.

Але работнікі Белкалгаспасэнсаюзу не сьпяшаюцца выканаць дырэктывы Наркамзему. На сёньняшні дзень ня вылучан спэцыяльны працаўнік, які-б адказваў за арганізацыю гадавальніка. Спэцыялістаў Насеннаводсаюзу таксама ня вылучыў. Працаўнікі Насеннаводсаюзу самі прызнаюцца, што пастанову Наркамзему яны чыталі, але нічога яшчэ не зрабілі.

**Ш.**

## З 16 проц. да 27

СЬВІСЛАЧ. ДА 1 КРАСАВІКА РАБОТА ПА РАЗГОРТВАНЬНІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ АМАЛЬ НЕ ПРАВОДЗІЛАСЯ. У ВЫНІКУ ЧАГО ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЫЎ ВЕЛЬМІ НІЗКІ — 16. ПАСЬЛЯ АДНАЎЛЕНЬНЯ КІРАЎНІЦТВА І МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСЯГО ПАРТЫЙНАГА І КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ДЭКАДНІКА ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ У ПАЛІТЫЧНЫХ КАМПАНІЯХ, КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ РАЁНУ ЗА АДЗІН МЕСЯЦ ВЫЛА ДАВЕДЗЕНА ДА 27 ПРОЦ.

РАШУЧА БЫЛА ПРАВЕДЗЕНА АЧЫСТКА КАЛГАСАЎ АД КУЛАЦКІХ ЭЛЕМЭНТЎ. ПРАВЕДЗЕНАЯ РАЁННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПАРТЫЗАН ПАСТАНАВІЛА ЦАЛКАМ УСТУПІЦЬ У КАЛГАСЫ.

**ЯЦЫНА.**

## 7 трактараў без гаручага

**ЧАРЭЯ.** На балотным масыве з 6. калфонду на плошчы ў 1.437 гэкт. арганізован новы саўгас «Абрубы-Чысьцік». Для апрацоўкі гэтай глебы пастановай райвыканкому саўгасу перададзены 7 трактараў, якія знаходзяцца ў вядзеньні Чарэйскага райкалгасаюзу.

Да гэтага часу трактары і прычэпны да іх с.-г. інвэнтар не адрамантован. Гаручым, бензынай і нафтай трактары зусім не забясьпечаны. Райкалгасаюз кажа, што забясьпячэньне трактараў гаручым зьяўляецца справай райсаюзу, а райсаюз узвальвае на райкалгасаюз. У выніку ніхто гэтай справай не займаецца.

**Балашоў.**

## Калгас „Ударнік“ скончыў ворыва

МАГІЛЕЎ. 30 красавіка калгас «Ударнік», Бэндараўскага сельсавету, выехаў у поле. Работа праходзіць ударнымі тэмпамі на аснове зьдзельшчыны, над знакам шырокага разгортваньня сацпаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі і асобнымі калгаснікамі.

Калгасам узоран увесь яравы клін — 178 гэкт.

Нормы выпрацоўкі ўсімі брыгадамі перавыконваюцца. Напрыклад, брыгадзе імя 518 з 10 чал. было дана заданьне за 60 працадзён на 20 конях узараць 36 гэкт. Выканана — за 50 працадзён.

Брыгада на ворыве клину на віку сваё заданьне ўзараць 12 за 36 працадзён выканала за 30. Брыгада цесьляроў скончыла рамонт калёс раней тэрміну на 8 дзён.

Калгас прыступае да сяўбы раньніх культур. Ударная работа калгаснікаў выклікала новы прыліў у калгасы. За тры дні работы калгаса ў полі ўлілося 7 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

## Чакаюць цыркуляраў

*Сельсаветы—у баку ад пасеўнай*

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. Рад сельсаветаў раёну ня сталі на чале кіраўніцтва сяўбой. Большасьць сельсаветаў ня цікавіцца гэтай работай. Сельсаветы ня зьбіраюць вестак аб ходзе сяўбы, ня ведаюць, што робіцца на мясцох.

Так, для прыкладу можна ўзяць Забабскі сельсавет, дзе старшыня Новікаў у самы разгар сяўбы паехаў невядома куды па асабістых справах і 4 дні не зьяўляецца на работу. Сельсавет цэлымі днямі закрыт.

Аб уборачнай кампаніі і аб пастановах СНК па гэтым пытаньні ніхто ў раёне ня ведае. Ніякай падрыхтоўчай работы да ўборкі не праводзіцца. Раённыя работнікі сядзяць і чакаюць цыркуляраў. Справа падрыхтоўкі да ўборкі ня ўвязваецца з правядзеньнем да весняй сяўбы.

## ВОЎК У АВЕЧАЙ СКУРЫ

### Вылазка клясавага ворага на заводзе „Камунар“

*Былы заводчык і домаўласьнік Волін сыстэматычна зрываў работу прадпрыемства*

**Вызваліць савецкі апарат ад асколкаў рамзіншчыны!**

Ва ўчарашнім нумары «Зьвязды» ў заметцы «Бухгальтар — хуліган Волін выключан з членаў саюзу» мы паведамілі аб агідным факце, які меў месца на менскім заводзе «Камунар». Галоўбух заводу Волін даў апляўху загадчыку пададдзелу забясьпячэньня Кауфману, калі апошні зьвярнуўся да яго з просьбай даць весткі аб польскасьці праданага лому.

Як выяўлялася, справа гэта больш складаная. Мы тут маем ня проста хуліганскі ўчынак, а самую наглую вылазку клясавага ворага.

Па-першае, хто такі Волін? Ён — былы заводчык, да рэвалюцыі і ў часе польскай акупацыі меў гарбарню (Клясная вул., № 22), на якой працавала каля 20 рабочых, і мылаварню. Апрача таго, Волін быў домаўласьнік, меў на рыгу вулі Валадарскага і Савецкай два дамы. Рабочыя, якія ў яго працавалі (яны зараз працуюць на заводзе «Бальшавік»), характарызуюць яго, як жорсткага эксплёататара, які рэльмі груба адносіўся да рабочых. Тав. Крыгерман — рабочы заводу «Бальшавік» — расказвае, што калі аднойчы ў часе польскай акупацыі рабочы прышоў да Воліна за грашыма, ён яму адказаў: «Гэта вам не савецкая ўлада, можаш пачакаць». Пасьля звароту савецкай улады ў Менск Волін быў арыштаваны і каля 3-х месяцаў сядзеў у турме.

Як ён потым трапіў на савецкую работу — невядома. Гэта павінны выявіць сьледчыя органы. Але характэрна, што ён каля году працаваў і на заводзе «Бальшавік» у якасьці бухгальтара і быў звольнен за тое, што ня справіўся з работай і заблытаў бухгальтэрыю.

Каля двух год ён ужо працуе на заводзе «Камунар». І вось як яго характарызуе дырэктар заводу т. Левін: «Ня гледзячы на тое, што Воліным было зроблена за час сваёй работы шмат памылак, раду супрацоўнікаў нанесены зьнявагі, за што меў вымовы ад заўному, ён ня справіўся з работай. За час яго работы былі адны толькі сілокіі. Але рабочая грамадзкасьць заводу прад'яўляе Воліну значна больш сур'ёзныя абвінавачаньні. Яшчэ ў шматгразкцы ад 1 мая Волін абвінавачваўся ў неажыцьцяўленьні раду мерапрыемстваў для пераводу цэхаў на гаспадарчы разрахунак. Волін нічога не зрабіў для ўкамплектаваньня рахункоўнага штату, у рахункаводзтве цэхаў да гэтага часу наглядаецца поўная расхлябанасьць. У той-жа час Волін сыстэматычна адмаўляўся ад прыёму бухгальтараў, якіх прысылала кіраўніцтва кадрамі. З пастановай аб рэарганізацыі бухгальтэрыі ў сувязі з пераходам на гаспадарчы разрахунак, аб стварэньні ў цэхах адзінага органу ўліку Волін агадзіўся, але на працягу паўтара месяца нічога не зрабіў для арганізацыі работы. Пытаньне аб пораблудове бухгальтэрыі нават не прапрацавана. Калі 4 мая дырэктар выдаткаў у габінэт галоўбуха і эканаміста для ўстанаўленьня паміж імі кантакту, Волін напаў на эканаміста з грубай лаянкай за тое, што ён «адважыўся» напісаць у шматтыражцы аб кепскай рабоце бухгальтэрыі. Волін упарта выступаў супроць упрадачэньня выдачы зарплаты рабочым. Улік работы так пастаўлен, што аднаму рабочаму было выдана 111 руб. без усякай падставы і гэта выявілася толькі дзякуючы ўласнай заяве работага. Супрацоўнікаў бухгальтэрыі, сваіх падначаленых Волін гаўсёды лаяў «бандытамі», «таўстаскурамі» і г. д.

Сьпіс гэтых абвінавачаньняў можна прадоўжыць, але і прыведзеных даволі, каб усталяваць, што Волін у сваёй рабоце імкнуўся дэзарганізаваць улік і рахункаводзтва, сеяць розьнь сярод працаўнікоў, падрываў найбольш важныя мерапрыемствы па ўпарадачэньні фінансавага становішча заводу.

У яго паводзінах на заводзе поўнасьцю выявіўся яго сацыяльны твар—былога заводчыка і домаўласьніка, ворага рабочай клясы. І вусім правільна заводзкі камітэт «Камунара» кваліфікаваў работу Воліна, як яўнае шкодніцтва, а апошні ўчынак Воліна—апляўху Кауфману,— як вылазку клясавага ворага.

Заўком пастанавіў выключыць Воліна з членаў прафсаюзу і прасіць адміністрацыю вынаць яго з працы. Апрача таго, заўком пастанавіў аддаць Воліна грамадзкаму суду і ўвесь матар'ял аб ім перадаць камісіі па чыстцы савецкага апарату. Рабочыя заводу на цэхавых сходах аднадушна ўхвалілі гэту пастанову.

Мы са свайго боку лічым, аднак, патрэбным, каб гэтай справай зацікавілася пракуратура. Адначасова пракуратура павінна вынайсьці прычыны, якія спрыялі таму, што Волін на працягу такога доўгага часу меў магчымасьць прадаваць на нашых прадпрыемствах і шкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву.

## Абаронца кулацкай гаспадаркі

(«ШМАТПОЛЬНЫЙ СЕВАЗВАРОТЫ БССР». ПРАФ. СІНЗР, БДВ, 1930 г.).

Прыходзіцца вельмі здзіўляцца, якім чынам магла быць выдана ў 1930 г. кніжка праф. Вінэра «Шматпольныя севазвароты БССР», якая па сваім зьмесьце зьяўляецца шкодніай кніжкай. Карыстаючыся паслугамі Белдзяржвыдавецтва, аўтар паказанай кніжкі выступае на сутнасьці супроць мерапрыемстваў, якія праводзяцца партыяй і ўрадам па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Кніжка праф. Вінэра прызначана не для буйных спэцыялізаваных сацыялістычных гаспадарак (саўгасаў ці калгасаў), а для індывідуальнай гаспадаркі, галоўным чынам, для кулацкай «прыналўпасьці»—як заўўляе сам аўтар (ка 31-й 32-й старонках), 8-мі шт. скаціны на 6 гэкт. пахаці».

Вызначаючы 6-ці — 8-мінольныя севазвароты для індывідуальных гаспадарак, аўтар гэтым самым даводзіць устойлівасьць індывідуальнай гаспадаркі і такім чынам неабходнасьць разьвіцьця кулацкай гаспадаркі і зусім ігнаруе праходзячыя шпаркімі тэмпамі працэсы калектывізацыі. Відавочна, што аўтар проста выступае супроць лёзунгу партыі аб сканчэньні ў асноўным да канца пяцігодкі калектывізацыі СССР. Зразумела, што ўстаноўкі кніжкі цалкам накіраваны супроць ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Прыводзячы між іншым рад прыкладаў з дасягненьняў асобных саўгасаў і калгасаў Беларусі, праф. не гаворыць аб пераваце буйной сацыялістычнай гаспадаркі, а імкнецца гэтыя дасягненьні прыстасаваць да індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.

Мы выпускаем цэлы рад выразаў накшталт «перадавыя гаспадары - сяляне», якія цалкам узяты з нацдэмаўскай, прышчэпаўскай практыкі, вакіраванай да пасяджэньня культурных гаспадароў тыпу кулака Марозава.

Аўтар у паказанай кніжцы выступае супроць спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Усе вызначаныя ім севазвароты разьлічаны на тып замкнутай універсальна-спажывецкай дробнай сялянскай гаспадаркі.

Вось, што гаворыць аўтар (старонка 25-я) па гэтым пытаньні: «Для сялянскіх-жа гаспадарак, якія патрабуюць перш за ўсё поўнай забясьпечанасьці збожжам, трэба было-б зьмяніць сямінольны севазваротаў так, каб крыху зьменшыць кармавыя засевы на карысьць жыта». З прыведзенай цытаты выразна гідаць шкодныя ўстаноўкі праф. Вінэра, накіраваныя супроць дырэктыў партыі і ўраду аб спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, аб замене менш выгадных культур больш выгаднымі.

Аўтар выказваецца супроць упчыльненьня ільняных севазваротаў. Ён лічыць, што пры складаньні ільняных севазваротаў трэба аддаць перавагу больш доўгім севазваротам, пачынаючы з шасьпольля (з адным ільняным палеткам пасьля траў) і канчаючы 10-польным севазваротам, дзе можна ўвесьці 2 ільняных палеткі; адзін пасьля траў і другі пасьля палетку абсыпаных расьлін (старонка 37-38).

На самой справе спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі патрабуе ад нас максымальнага ўшчыльненьня ільняных севазваротаў у саўгасах і калгасах да 25-30 проц. ільну ў севазвароце.

Ідэалам аўтара зьяўляецца універсальны тып спажывецкай індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.

Рэкамэндуючы пераходныя севазвароты ад трохпольля да шматпольля, аўтар мае на ўвазе, каб гэтыя севазвароты «ня вымагалі-б карэннага ламаньня трохпалёўкі». Камэнтары не патрэбны.

Напомнім толькі аўтару, што зараз перад сялянска-серадняцкім сялянствам стаіць пытаньне ня толькі ліквідацыі трохпольля, як адсталай формы вядзеньня гаспадаркі, але поўная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі шляхам пераўтварэньня дробных распыленых аднаасобных гаспадарак у буйныя мэханізаваныя і спэцыялізаваныя сацыялістычныя гаспадаркі.

Усё ўзрастаючым калгасным прыбоем, дасягнутымі посьпехамі ў гэтай галіне аспоўныя масы сялянства ўжо даўно прагаласавалі за сацыялістычны шлях разьвіцьця супроць капіталістычнага, які рэкамэндуецца ў паказанай прафэсарскай кніге.

**Б. Р.**

# Арганізаваць пашы для сьвіней

Задача, пастаўленая партыяй і ўрадам — вырашыць у асноўным жывёлагадоўчую праблему на працягу 1931 году —патрабуе для свайго ажыцьцяўленьня арганізацыі моцнае кармовае базы ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах.

Зараз вельмі востра стаіць пытаньне з забясьпячэньнем канцэнтраванымі кармамі сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм. Разам з гэтым, каб забясьпечыць поўнае выкананьне праграмы 1931 г. па давядзеньні матэчнага стада ў Саўгасах Сьвінавода да 75.000 штук, у калгасных таварных фэрмах да 150.000 штук, мы павінны рашуча ўзмацніць тэмпы фармаваньня матачнага стада ў саўгасах і калгасных фэрмах.

Выхад з нагружанага становішча з кармамі на працягу ўсяго летняга часу і ранняй веснавой ёсьць. Саўгасы і калгасныя фэрмы павінны яго знайсьці ў стварэньні добрых раньніх пашаў для сьвіней.

### ЯКОЕ ЗНАЧЭНЬНЕ МАЮЦЬ ПАШЫ

Пашы даюць танныя, зялёныя, сакавітыя карма і зьяўляюцца добрым сродкам для ўмацаваньня здароўя сьвіней. Гэта рашаючы момант, бо толькі здаровае саўгаснае і калгаснае сьвінае стада будзе выгодным.

Апрача гэтага, пашы даюць магчымасьць значна зьменшыць выдаткі моцных кармоў. Пашы пагашаюць галоўных кармоў, якія пагашаюць галоўных амэрыканскіх дасьледчых станцый, 1 гэкт. пашы дае на 600 руб. сьвінины.

Пашы вельмі каштоўныя для сьвіней усіх узростаў. Асабліваю каштоўнасьць яны прадстаўляюць для парасят таму, што даюць корм, багаты вітамінамі і мінэральнымі матэрыямі, у якіх маладняк адчувае вялікую патрэбу для свайго росту.

### ГАЛОЎНЕЙШЫЯ КУЛЬТУРЫ ДЛЯ ПАШАЎ

**Віка-аўсяная мешаніна.** У 1931 годзе найбольш пашыраная і палыхоўлічая культура для закладкі пашаў будзе віка-аўсяная, або віка - гарохавая мешаніна. Калі пасеяць гэту мешаніну раньняя веснай, то пры спрыяючым надворʼі праз 35-40 дзён яна прыгодна для пасьбы. Спасваць расьліны можна тады, калі яны дасягнуць вышыні 20-25 сантыметраў. Перарослую віка-аўсяную мешаніну сьвіньні паядаюць неахвотна, таму скарміваньне мешаніны трэба скончыць да таго часу, калі яшчэ не завязаліся струкі. Віка-аўсяныя пашы даюць вельмі многа лаштоўнага для сьвіней зялёнага корму, але яны за кароткі час вытоптваюцца сьвіньнямі. Мешанна дрэнна адрастае пасьля страўліваньня яе на корані, а таму віка-аўсяную ня не на корані, а таму віка-аўсяную гарохавую мешаніну неабходна скормліваць у скошаным вытлядзе, як дадатковы корм, напрыклад, да мінэральных мінэральных пашаў.

Канюшына чырвоная таксама каштоўная паша для сьвіней, пасьбу па канюшыне можна пачынаць з таго часу, калі расьліны адрастуць на 12-20 сантыметраў ад зямлі. Канюшына з вялікай прымешкай цімафеўкі для пашы сьвіней мала прыгодна таму, што цімафеўка вельмі шпарка адрастае і грубее. У такім выглядзе сьвіньні яе зусім не паядаюць.

На канюшыне засеву 1931 году пры ўмове, калі яна добра адрасьце і пры добрым надворʼі ўвосень можна дапусьціць пасьбу сьвіней, пры гэтым неабходна сачыць за тым, каб сьвіньні ня рылі гэтых пашаў. Каб пазбавіцца вытоптваньня канюшыны, дык у яльготнае дажджлівае надворʼ пасьбу сьвіней на канюшыне засеву 1931 году лепш не дапускаць. У тых сьвінагадоўчых саўгасах і калгасных фэрмах, дзе плошчы пад канюшынай абмежаваныя, лепшыя вучасткі канюшыны выкарыстаны ў бягучым годзе не для пашы, а для ўборкі на сена з таксім разьлікам, каб поўнасьцю забясьпечыць сьвінае стада на зіму 1931-1932 году добрым сенам бабовых.

Люцэрна больш падыходзіць для пашы парасят. На люцэрне пасьбу сьвіней можна пачынаць, калі яна адрасьце на 17-20 сант. Пры пасьбе сьвіней на люцэрніках трэба сачыць за тым, каб жывёла не абʼядала яе да карэня таму, што гэта выклікае высьленьне пашы і пазбаўляе яе ня прыгодным для далейшага карыстаньня. Зусім не дапускаецца пасьба сьвіней вясной і ўвосень на люцэрніках, закладзеных вясной 1931 г.

**Азімае жыта.** Пасеў азімага жыта раньняй вясной дае добрыя пашы для сьвіней. У тых выпадках, калі немагчыма арганізаваць асеньнюю пашу з іншых культур у сярэдзіне і ў канцы лета, можна рабіць спэцыяльны раньні пасеў азімага жыта для скарыстаньня яго ўвосень 1931 году, як позьнюю асеньнюю пашу. Для гэтае мэты павінна быць выкарыстана зерня другога гатунку і норма высяваньня павінна быць павялічана арыентавачна на 20-25 проц.

Апрача пералічаных вышэй найбольш пашыраных культур, можна стварыць пашы для сьвіней за кошт высяваньня мешаніны аўса і ячменю, сарадэлі, палыні, тапінамбуру (земляная груша), дожыніку і інш.

### СКАРЫСТАНЬНЕ ПАШАЎ

Пасьба сьвіней па асобных відах пашы павінны весьціся з такім разьлікам, каб пасьля скарыстаньня адных пашаў сьвіньні маглі быць перакінуты на іншыя. У бягучым годзе для самай раньняй пасьбы сьвіней сьвінагадоўчымі саўгасамі і калгасамі павінны быць выкарыстаны натуральныя пашы (зарасьлікі, сухадольныя сенажаці, узьбяражы рэчак і інш.).

Пры адводзе пад вынасы сухадольных сенажацяй неабходна правесьці раньняй вясной угнаеньне іх гноем, гнойнай жыжкай ці мінэральнымі тукамі.

Пачынаючы з другой палавіны чэрвеня, ужо можна пасьвіць сьвіней на штучных пашах.

Кожны саўгас і сьвінагадоўчая калгасная таварная фэрма павінны выпрацаваць свой удасканалены плян найбольш рацыянальнага разьмеркаваньня і выкарыстаньня пашаў паасобнымі ўзроснымі групамі сьвіней на працягу ўсяго пэрыяду пасьбы. Па кожнай групе ў клане павінны быць паказаны вучасткі, якія вызначаюцца пад вынасы, тэрміны выкарыстаньня іх і пераходу на іншы вучастак.

### РАЗЬЛІК ПАШАЎ

На адным гэктары сярэдняй штучнай пашы можна забясьпечыць зялёнай масай на працягу 100 дзён 25 падсьвінкаў з сярэдняй гадавой жывой вагай 30-20 кгр., г. зн. адзін гэктар пашы дае 2.500 кармовых штукадзён для падсьвінкаў паказанай жывой вагі. Для даросных непаросных і паросных матак нагрузка на 1 гэкт. пашы павінна быць зьніжана ў 1½-2 разы ў залежнасьці ад жывой вагі матак.

На адным гэктары пашы сярэдняй якасьці можна прапасьбіць 10 штук падсосных матак разам з парасятамі да адлучэньня. Выходзячы з выпэйпаданых лічбаў і маючы склад стада, які ў летні час будзе ўтрымлівацца на пашах, вельмі проста падлічыць агульную плошчу, патрэбную для пашы ў розныя пэрыяды сезону.

Напрыклад, пры складзе сьвінога стада ў 100 матак і 600 падсьвінкаў патрэбна на тэрмін з 15 мая па 15 чэрвеня: 1) для 100 матак непаросных і паросных 3.000 кармовых штукадзён (30 дзён на 100 штук). Адзін гэктар забясьпечвае толькі 1.250 кармовых штукадзён, адэкуль відаць, што для 100 матак патрэбна мець 2,4 гэкт. 2) Для 600 падсьвінкаў — 18.000 кармовых штукадзён, а кожны гэктар дае 2.500 штукадзён, таму для падсьвінкаў патрэбна мець 7,2 гэкт. Такім чынам, для ўсяго стада на паказаны пэрыяд патрэбна 9,6 гэкт. пашы, якая павінна быць прыгодная для спасваньня яе сьвіньнямі ў гэты пэрыяд часу.

Для ўстанаўленьня агульнай патрэбнасьці ў плошчы пад пашу неабходна весьці падлік у такім-жа напрамку. Пры гэтым лепш мець некаторы лішак пашы, чым яе недахват, бо лішнюю зялёную масу заўсёды можна выкарыстаць на сена або на сілас.

### ПАДРЫХТОЎКА СЬВІНЕЙ ДА ПАШЫ

У сувязі з рознымі запатрабаваньнямі паасобных узростаў і груп сьвіней у падрыхтоўцы да пашы, сьвінае стада трэба разьбіць на наступныя групы:

1) маткі з парасятамі да адлучэньня ў асобным стадзе на 25-30 матак. Прычым гэтае стада трэба групаваць так, каб маткі з парасятамі ва ўзросьце да 3-4 тыдняў былі ў адным табуне, а маткі з парасятамі звыш 3-4 тыдняў і да адлучэньня ў другім табуне.

2) Маткі паросныя ў апошні пэрыяд паросьнасьці (за 1 месяц да апаросу)—да 100 штук.

3) Маткі даросныя непаросныя і паросныя да пачатку 4-га месяца паросьнасьці—да 300 штук.

4) Маткі маладыя, непаросныя—да 500 штук.

5) Парасята да адлучэньня і старэй —да 500 штук.

Пры вырошчваньні ў саўгасах і калгасных фэрмах храчкоў маладняк, пачынаючы з чатырохмесячнага ўзросту, разьбіваюцца на дзьве групы: на храчкоў і сьвінак.

Прыведзеныя разьмеры груп зьяўляюцца арыентэвачнымі. Кожная сьвінагадоўчая гаспадарка павінна ўдасканаліць іх у залежнасьці ад умоў пасьбы, наяўнасьці стада і іншых гаспадарчых умоў саўгасу і калгасу, пры гэтым павінна быць забясьпечана найбольш спакойная пасьба і ўтрыманьне сьвіней. Для папярэджаньня выкідышаў ад даўкі і ўдараў асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на спакойнае ўтрыманьне і пасьбу даросных матак у апошні месяц паросьнасьці. Да пачатку пасьбы трэба таксама правесьці дэтальны агляд усяго стада, абрэзаць і пачысьціць сьвіньням капыты.

### ПАРАДАК ВЫПАСУ

Парадак выпасу павінен быць дэтальна прапрацаваны ў кожным саўгасе і калгасе з улікам усіх мясцовых умоў. Пры ўстанаўленьні яго неабходна кіравацца наступнымі правіламі:

Перагон сьвіней ад месца іх стаянкі да пашы не павінен перавышаць: а) для матак даросных у апошні пэрыяд паросьнасьці—0,5 клм., б) для матак падсосных з парасятамі—0,5 клм., в) для матак непаросных і паросных да пачатку апошняга месяца паросьнасьці—1-1,5 клм., г) для вытворцаў—1-1

*Мясапрадукты—рабочым цэнтрам*

# Не здаваць тэмпаў загатовак жывёлы

**Цыркулярамі мяса не загатовіш—Патрэбна мяссавая работа вакол загатовак. Неабходны рашучы націск на кулака**

**ВАЙНА ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫМ НАСТРОЯМ І МЕСЬНІЦТВУ Ў ЗАГАТОЎКАХ МЯСА!**

## 63,2 проц. гадовага пляну

Дырэктыва студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб выкананьні да 1 красавіка 70 проц. гадавога пляну загатовак жывёлы ня выканана па 60 раёнах. План загатовак на 1 мая выканан на 63,2 проц.

КАСЬЦЮКОВІЦКІ І ЖУРАВІЦКІ РАЁНЫ ЗАГАТОВІЛІ МЕНШ 30 ПРОЦ. ПЛЯНУ, БАРЫСАЎСКІ, БЫХАЎСКІ, ПРАПОЙСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, СЬМІЛАВІЦКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ — МЕНШ 40 ПРОЦ.

Становішча са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак сьведчыць аб апартуністычных адносінах у радзе месц да кулацкіх элементаў. Так, напрыклад, па БЫХАЎСКІМ раёне цьвёрдыя заданьні даны ў разьмеры 5 проц. агульнага пляну замест 20-25, прычым гэтыя зьменшаныя заданьні выкананы толькі на 23,7 проц., па ДЕЛЬЧЫЦКІМ раёне цьвёрдыя заданьні складаюць 8 проц. пляну, выканана 51 проц.

Паказаныя лічбы гавораць аб тым, што райкомы і РВК пералічаных раёнаў не змаглі па-большавіцку ўзяцца за загатоўкі і выканаць ускладзеныя на іх задачы.

Каб ліквідаваць прарывы ў загатоўках, трэба зараз-жа ўжыць рашучыя меры да поўнага спагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулакоў, да выкананьня дырэктывы аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў у разьмеры 20-25 проц. пляну.

Раённыя арганізацыі павінны мабілізаваць вакол загатовак жывёлы бядняцка-серадняцкія масы, калгасьнікаў і раённы актыў. Трэба праверыць работу камісій содзейнасьці загатоўкам жывёлы і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто правяўляе злачынную бязьдзейнасьць у гэтай справе.

Л. КАГАН.

## Ганебна зрываюць загатоўкі жывёлы

Ня гледзячы на тое, што прайшлі ўсе тэрміны, 18 раёнаў да 1-га мая ня выканалі нават паловы гадавога заданьня. Касьцюковіцкі раён загатовіў толькі 29,1 проц., Журавіцкі—28,9 проц., Сьмілавіцкі—38,1 проц., Лельчыцкі—38,9 проц., Менскі прыгарадны раён—39,5 проц., Чырвонапольскі—39,2 процантаў, Быхаўскі—36,6 проц., Круглянскі—43,3 проц. і г. д.

Невыкананьне пляну зьяўляецца вынікам апартуністычнай недвацэнкі жывёлазагатовак, наўменьшага пераварыць загатоўкі ў мясавую палітычна-гаспадарчую кампанію.

## Ня менш 85 проц. да 1 ліпеня

### Тэлеграма ЦК і СНК

**Сакратаром райкомаў, старшыням райвыканкомаў (52 раёнаў)**

Канстатуем невыкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб ажыцьцяўленьні пляну загатовак жывёлы да 1-га красавіка ня менш, чым па 70 проц. Бязьдзейнасьць апарату ў вашым раёне і апартуністычныя настроі вакол загатовак жывёлы стварэюць пагрозу зрыву забесьпячэньня асноўных пралетарскіх цэнтраў краіны, правядзеньня такіх важнейшых мерапрыемстваў, як камплектаваньне стада сацыялістычнага сэктару, правядзеньня нагульных анэрацый.

Прапануем пад вашу асабістую адказнасьць на працягу першай дэкады мая стварыць рашучы пералом, абвясьціўшы барацьбу дэмабілізацыйным настроям з боку загатоўчых арганізацый, спыніць мабілізацыю работнікаў жывёлазагатоўчых апаратаў на іншыя кампаніі, мабілізаваных неадкладна вярнуць, скарыстоўваючы правядзеньне іншых чарговых кампаній для ўзмацненьня ходу загатовак жывёлы. Плян загатовак павінен быць абавязкова выкананы да 1-га ліпеня ня менш чым на 85 проц.

**Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.**
**Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.**

## Пакласьці канец разбазарваньню мясапрадуктаў

Мясазагатоўкі праводзяцца, у мэтах забесьпячэньня прамысловых цэнтраў прадуктамі харчаваньня, і ніхто ня мае права самачынна разбазарваць загатоўленую жывёлу, без дазволу належных арганізацый. Такая дырэктыва дана ўсім загатоўчым арганізацыям. Між тым, некаторыя з іх злосна парушаюць гэту—дырэктыву.

Каралінскі райкаапсаюз, які вядае ў сваім раёне загатоўкі жывёлы, адпусьціў адну карову начальніку міліцыі т. Гарбачову, у сувязі з хваробай яго жонкі, і дзьве кароўы—гр. Антоненку, і Сімёнаву, у сувязі са здачай імі сваіх кароў па кантрактацыі.

Начальнік міліцыі, які павінен наглядаць за выкананьнем дырэктыў, сам парушае іх.

Няўжо райкаапсаюз ня ведае, што атрыманая па кантрактацыі жывёла не замяняецца іншай

Разбазарваньне загатоўленай жывёлы зьяўляецца злачынствам, якое зрывае рабочае забесьпячэньне.

Каралінскі раён ня выканаў пастановы пленуму ЦК аб давядзеньні пляну загатовак да 1 красавіка да 70 проц. Выканана ім кампанія 59 проц. гадавога пляну, спагнана па цьвёрдых заданьнях толькі 35,5 проц.

Арганізацыі Каралінскага раёну павінны зараз-жа рашуча ўзяцца за поўнае выкананьне пляну мясазагатовак, за спагнаньне жывёлы з кулацка-заможных гаспадарак. Трэба пакласьці канец разбазарваньню мясапрадуктаў.

Журомскі.

## Раўненьне па Полаччыне

**ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Полацкі раён дабіўся значных дасягненьняў у загатоўках жывёлы. Дзякуючы калектыўнаму кіраўніцтву партыйных арганізацый, дзякуючы своячасоваму націску на кулака і рашучым мерам па спагнаньні цьвёрдых заданьняў па мясазагатоўках, плян загатовак жывёлы выканан амаль на 92 проц. Кулацкія гаспадаркі поўнасьцю здалі цьвёрдыя заданьні, калгасы выканалі 130 проц. пляну кантрактацыі буйной рагатай жывёлы. Горш стаіць справа з кантрактацыяй маладняка.**

**Тэмпы мясазагатовак ні ў якім разе не павінны быць зьніжаны. Шляхам далейшай разгорнутай работы трэба дабіцца перавыкананьня заданьня.**

А. Шустры.

## На чырвоную дошку

НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ ДА 1 МАЯ ПЕРАВЫКАНАЛІ ГАДАВОЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗАГАТОЎКАХ ЖЫВЁЛЫ:

АСЬВЕЙСКІ РАЁН ЗАГАТОВІЎ 133,3 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

ВАЛЫНЕЦКІ РАЁН ВЫКАНАЎ 121,4 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ЗАСЛАЎСКІ ЗАГАТОВІЎ 124,3 ПРОЦ.

ХАЛОПЕНІЦКІ — 101,6 ПРОЦ. І ЧАШНІЦКІ—102,7 ПРОЦ.



Жыльлёвае будаўніцтва ў Гомелі

## Гастролі Беларускага рабочага тэатру

Беларускі рабочы тэатр ЦСПСБ зараз замоцнена рыхтуе пастаноўку новай п'есы Н. Федзіна — **«Чынгільбуд»**. Пастаноўкай кіруе рэжысэр тэатру В. Я. Галаўчынер. П'еса будзе пастаўлена 20 мая.

З 15 мая па 1 чэрвеня тэатр будзе працаваць у летнім тэатры саду «Прафінтэрн». У рэпэртуары тры п'есы: **«Стрэл»** — Вязьменскага, **«Вецер з мора»** — Чыркава і **«Чынгільбуд»**—Федзіна. 1 чэрвеня тэатр выедзе ў раёны БССР. У першую чаргу тэатр наведае **Магілеў, Быхаў, Рагачоў, Мазыр, Жлобін.**

## Заклікаць да парадку т. Лупецкага

Брыгада рабочых шклоўскай фабрыкі **«Спартак»** праверыла работу тарадзкога спажывецкага таварыства. Аднак, калі брыгадзіры зьявіліся ў РСІ за адведным мандатам, сакратар РСІ тав. Лупецкі пакінуўся на іх з лаянкай, што няма чаго правяраць работу сталоўкі. Між тым, на сходзе рабочых фабрыкі было ўзьнята пытаньне аб сталоўцы, што там работа пастаўлена дранна.

Калі брыгада заявіла тав. Лупецкаму, што яго паводзіны ня варты адказнага работніка РСІ і што яны напішуць аб гэтым у газэту, ён яшчэ больш разлаваўся і сказаў: «Можаце пісаць, колькі хочаце, я нічога не баюся».

Трэба навучыць тав. Лупецкага адносіцца з большай павагай да рабочай брыгады.

Брыгада.

## Пашырэньне сеткі дзіцячых ясьляй

НКАсьветы і Аховы Здароўя распрацавалі плян пашырэньня сеткі ясельных і дашкольных устаноў на 1931 год. Усяго ў бягучым годзе будзе адкрыта 2.309 дзіцячых устаноў, якія ахопяць 69.350 дзяцей. Дашкольных устаноў будзе адкрыта 1.075, ясьляй — 1.234.

## 5 выпуск менскага гідратэхнікуму

Нядаўна адбыўся 5-ты выпуск менскага дзяржаўнага гідратэхнікуму. Усяго выпушчана 65 спецыялістаў-гідратэхнікаў, з якіх 83 проц. накіраваны на работу ў розныя раёны БССР. Сярод выпускнікоў: рабочых — 37 проц., сялян — 41,5 проц., служачых — 21,5 проц.; членаў і кандыдатаў КП(б)Б — 9,2 проц., камсамольцаў — 55,4 проц.

# Па Савецкай Беларусі

## Скарыстаць вопыт тав. Радоцкага

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Адозва рабочых фабрыкі «Дзьвіна» і Аршанскага ільнакамбінату не надхоплена мясцовымі арганізацыямі, бядняцка-сераднякцкія масы не мабілізаваны на навалічэньне тэмпаў ільназагатовак, у мэтах забесьпячэньня сырцом тэкстыльнай прамысловасьці. Ні адзін з сельсаветаў не знайшоў патрэбным паставіць гэта пытаньне на пленуме сельсавету.

Наглядаюцца праваапартуністычная стаўка на самацёк, нежаданьне і няўменьне правесьці масавую растлумачальную работу, спасыланьні на тое, што «вясной лён нельга загатаўляць». Загатоўшчык райкаапсаюзу па Хрып'ялаўскім сельсавеце Клябанаў настойліва запэўняе, што «ў сяляні ільну няма». Яму ў гэтым дапамагае праўленьне райкаапсаюзу, якое за красавік не разаслала плянаў ільназагатовак.

Хрып'ялаўскі сельсавет у сваю чаргу заражан дэмабілізацыйнымі настроямі і, супакоіўшыся на выкананьні пляну за лік сацыялістычнага сэктару (калгас імя Дзяржынскага здаў 146 проц.), нічога ня робіць, каб спагнаць лён па кантрактацыі і па цьвёрдых заданьнях. **Сельсавет не адчувае адказнасьці за бесьперабойную работу тэкстыльнай прамысловасьці.**

У выніку па Магілеўшчыне плян ільназагатовак па калгасным сэктары выкананы на **78,2 проц.**, па аднаасобным — **на 37 проц. Як інакш, як не паблажнай кулаку, як не дапамогай яму можна расцэньваць такі факт, калі кулацка-заможныя гаспадаркі здалі цьвёрдых заданьняў на 3,8 проц. агульнага пляну.**

Між тым, лён ёсьць, трэба толькі разгарнуць **масавую работу** сярод аснoўных мас сялянства і **націснуць на кулака.** Вось прыклад, які разьбівае ўшчэнт апартуністычныя разважаньні некаторых кіраўнікоў сельсаветаў і загатоўшчыкаў, пакшталт Клябанава. Па Хрып'ялаўскім сельсавеце адзін старшыня сельскага спажывецкага таварыства, які змог згуртаваць вакол сябе вясковы актыў, загатовіў за 15 дзён красавіка 480 клг. ільну. **Член Вендарскага сельсавету, тав. Радоцкі, добра ўсьвядоміўшы значэньне ільназагатовак у справе забесьпячэньня сырцом тэкстыльнай прамысловасьці, прапрацаваў адозву рабочых «Дзьвіны» і Аршанскага ільнакамбінату сярод бядняцка-сераднякцкіх мас вёскі і калгасьнікаў і арганізаваў ударную брыгаду, якая дапамагала яму растлумачыць значэньне загатовак для ўсёй нашай народнай гаспадаркі.** Брыгада абыходзіла ўсе хаты і вяла гутаркі пакоп ільну. Такім мэтадам яна дабілася значных вынікаў: за першы дзень ён загатовіў 160 кілё, за другі — каля 196, за трэці — каля 128. Гэта кажа аб тым, што лён ёсьць, трэба ўмець яго загатовіць.

Вопыт тав. Радоцкага трэба перанесьці ў іншыя вёскі Магілеўскага раёну.

Шляхам правядзеньня бальшавіцкай масавай работы, напісаньня руйнуючага ўдару па апартуністычнай стаўцы на самацёк, па кулацкіх «пячальніках» можна выканаць і перавыканаць пляны загатовак.

Прахарэнка.

## У Гомелі не сьпяшаюцца

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Праграма лесасплаву па Гомельскай сплаўнай кангоры павялічана супроць мінулага году на 95 проц. Гэта, здавалася-б, павінна было прымусіць песазагатоўчыя арганізацыі своячасова падрыхтавацца да сплаву. Між тым, трэба сказаць, што да сёнешняга дня сплаўная кантора не разгарнула бальшавіцкіх тэмпаў падрыхтоўкі.

Замест 6,5 млн. шт. гужбы ёсьць 2.800.000.

Завербавана 5.000 плытагонаў (паводле пляну патрэбна 6.000), але завербаваныя рабочыя яшчэ ня выйшлі на работу. Гэта пагражае ходу сплаву, паколькі ня будзе скарыстаны высокі узровень вады.

Канчаткова ня вырашана пытаньне аб круглясутачнай буксіроўцы песу. Хоць заключаны дагавор з водным транспартам, але ў гэтым дагаворы не адзначана, хто адказвае за пагрузчана-разгрузчаныя работы.

Буксірныя сродкі самой сплаўнай канторы не падрыхтаваны. Штаб садзейнасьці сплаву даў тэрміновы загад заводам «Пралетары» і «Рухавік рэвалюцыі» скончыць рамонт суднаў, аднак, рамонт яшчэ ня скончан.

## Парт'ячэйка адказвае за слабую работу камсамольскага калектыву

Задачы ажыцьцяўленьня праграмы трацяга году пяцігодкі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуюць ад вясковага камсамолу балвой работы. Асабліва гігантыкія задачы стаяць перад камсамолам у справе правядзеньня другой бальшавіцкай слабы, у справе арганізацыі працы ў калгасах і г. д. Камсамол можа спраўціца з гэтымі задачамі толькі пры ўмове, калі перабудуе сваю работу, калі вакол сябе згуртуе самыя шырокія масы калгасу і бядняцка-сераднякцкай моладзі. На жаль, рад ячэек камсамолу, напрыклад, ячэйка ЛКСМБ **Старога Сала.** Гэта ячэйка, якая налічвае 89 камсамольцаў, яшчэ у мінулым годзе рэарганізавалася ў калектыў (бюро заставаны 4 цэх'ячэйкі, а іх 3 пры калгасах). Цэх'ячэйкі бязьдзейнічаюць. Камсамольцы ня ідуць у першых радах ударнікаў, безадказна адносяцца да выкананьня сваіх абавязкаў у калгасе. Камсамольцы ня прымаюць удзелу ў рабоце штворчых нарад.

Бюро калектыву ЛКСМБ не зьвяртаецца мабілізуючым зьвяном, а пасіўным наглядальнікам апартуністычнай бязьдзейнасьці камсамольскіх цэх'ячэек. І сапраўды ў калгасе трактар працуе толькі 5 гадзін у суткі. Калі-б камсамол дапамог, дык можна было-б даць яму поўную нагрузку. Далей. Калі ў калгасе будавалася сіласная вежа і двор для скацины, дык камсамольцы ня толькі ня былі мабілізаваны на гэтую работу, а нават, калі ім трэба было ісьці на работу, як калгасьнікам, дык яны адмаўліліся ад работы.

Камсамольскі калектыў ня прымяняка ўдзелу ў правядзеньні асноўных палітычна-гаспадарчых кампаній (заготовкі, правядзеньне пазыкабраў, праўленьня калгасу і інш.)

Вакол задач другой бальшавіцкай вясны бюро калектыву не мабілізавала шырокіх мас як камсамольскай, так і беспартыйнай моладзі. Мы вічнім, што апартуністычная кіраўніцтва Старасельскага камсамольскага калектыву будзе неадкладна зьмянена. Раённае кіраўніцтва прымае меры ў адносінах партыйнай ячэйкі, якая абсугоўвае памянёны камсамольскі калектыў і ідзе ратых прыцягне да суровай адказнасьці. За бязьдзейнасьць камсамольскага калектыву вінаваты поўную адказнасьць партыйная ячэйка.

Бел Пенсоў.

## На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

### Пралетары БССР паказваюць прыклад клясавай салідарнасьці, дапамагаючы сваім братом з савецкага Закаўказьля

КУРСАНТЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ШКОЛЫ ПРАФРУХУ ПРЫ ЦСПСБ пастанавілі адлічыць у фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўкаскай СФСР 2 ПРОЦ. АД СВАЁЙ МЕСЯЧНАЙ СТЫПЭНДЫІ. Усе выкладчыкі школы ўносяць у гэты фонд па 5 руб. Курсанты і выкладчыкі школы выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсе школы і курсы Менску.

* * *

КАЛЕКТЫЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ ЦВК БССР правёў па падпісным лісьце збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня. Ужо сабрана 133 руб. Супрацоўнікі ЦВК выклікаюць пасьледваць іх прыкладу калектыў работнікаў СНК БССР.

* * *

РАБОЧЫЯ ЦЭХУ ХАРЧАВАНЬНЯ ЗАВОДУ «КАМУНАР» пастанавілі правесьці збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўкаскай савецкай рэспубліцы. Ужо сабрана 35 руб. Цэх харчаваньня выклікае ўсе цэхі заводу «КАМУНАР» і УСЕ ГРУПКОМЫ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ МЕНСКУ.

* * *

СМАЛЯВІЧЫ, 10. Прафсыпалкавая арганізацыя разгарнулі масавую работу па аказаньні дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Армянскай ССР. На сёнешні дзень сабрана па прафсаюзах 580 руб. Па лініі саматужна-прамысловай кааперацыі сабрана 266 руб. Сродкі зьбіраюцца.

## Памдзет БССР перавёў ЦВК-ЗСФСР 10,000 руб.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР зацьвердзіў пастанову прэзыдыуму цэнтральнай камісіі дапамогі дзецям аб водпуску **10.000 руб.** на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўкаскай СФСР. Грошы пераведзены ў распараджэньне ЦВК Закаўкаскай СФСР

## Разгарнуць загатоўку дубільнай кары

Яловая і дубовая кара — адзін з важнейшых відаў сырцу для нашай гарбарнай прамысловасьці. Аднак, загатоўкай гэтага сырцу амаль ніхто ня цікавіцца. Мясціх лесапрамгасы зусім адмаўляюцца ад загатоўкі кары. Так, попацкі лесапрамгас катэгарычна адмовіўся выканаць заданьне ў 335 тон яловай кары, ня гледзячы на тое, што гэта работа не прадстаўляе асаблівых труднасьцяй.

Рад работнікаў лічаць загатоўку кары справай выключна Саюзскуры. Яны зусім не разумеюць, што Саюзскура без актыўнага ўдзелу грамадзкасьці ня можа справіцца з задачай забесьпячэньня васьці краіны. Трэба дабіцца рашучага пералому ў загатоўках дубільнай кары. Лесбел павінен прыняць усе меры для ўзмацненьня гэтай работы. Вакол загатовак трэба мабілізаваць шырокія масы працоўных. Раённыя спажывецкія саюзы і калгасы, калгасы павінны прыняць актыўны ўдзел у гэтай справе.

НКАсьветы павінен мабілізаваць школьнікаў для ўдзіраньня кары, супкі, захоўваньня і здачы ае гарбарнай прамысловасьці. Трэба праводзіць гэту работу ў парадку сацыяпаборніцтва і ўдарніцтва.

Загатоўка кары павінна ісьці поўным ходам з тым, каб яна магла забясьпечыць нашу гарбарную прамысловасьць важнейшым сырцом.

Мішчанка.

## Паведамленьні

— Менгарком КП(б)Б сумесна з фракцыяй гарпрафсавету склікае сёньня, 11 мая, у 6 з пал. гада. веч. у залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх) **нараду па пытаньні аб пабудове парку культуры і адпачынку.** На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі гарсавету, камгасу, НКАсьветы, Дамсаг, УЗП, ГК ЛКСМБ, Белдзяржкіно, ЦСПСБ, радыё-цэнтру, старшыні ФЗМК, зав. «Камунар», «Бальшавік», імя Варашылава, ф-кі «Кастрычнік», абутк. ф-кі, зав. «ДА», друк. імя Сталіна, пяці, «Полымя рэвалюцыі», прадстаўнікі ЦП саюзаў будаўнікоў, мясцовна-будаўн. работных, працмастацтва, дрэвапрацоўшчыкаў і гарбароў. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— **Дом Камасьветы.** 11 мая ў 8 гада. веч. адбудзецца даклад т. **Выдры на тэму: «Твар нацдэмакратызму ў краязнаўстве».** Білеты на ячэйках і ў чытальні Дому.

— **Дом Пісьменьніка.** 11 мая ў 7 гадз. веч. адбудзецца агульны сход центральнай рабочай літаратурнай студыі БелАПП'у. Уваход вольны.

— **11 мая ў 7 гадз. веч., у Доме Пісьменьніка,**—агульны сход Менскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. У парадку дня: 1) Даклад пра пленум БелАПП'у; 2) Выбары дэлегатаў на пленум і іншыя пытаньні. Прысутнасьць усіх членаў БелАПП'у абавязкова. Нянуты да арганізацыйнай адказнасьці. Запрашаюцца рабочыя-ўдарнікі, літгуртковцы, студыйцы.

— **Менгарком КП(б)Б 12 мая ў 7 гада. веч., у памяш. залі пасяджэньняў гармасавай работы на прадпрыемствах.** На нараду павінны зьявіцца кіраўнікі агіт.-масавых сэктараў парткалектываў, ячэек і цэх. ячэек КП(б)Б, а таксама жаны працаўнікі і заг. агітпрапгабінэтаў.

— 12 мая ў 6 гада. веч. у Культпрапе ЦК КП(б)Б склікаецца нарада па ўвазе ны партасьветы з вывучэньнем тэхніка. Павінны зьявіцца наступныя т.т.: Куліненка, Любін, Улазаў, Саеніч, Сямёнаў, Яцкевіч, Пэрлін, Альгінская, Гурэвіч, Слонім, Васілевіч, Немец, Макоўскі, Садоўскі, Шукевіч, Гольдштэйн, Гурэвіч П., Голанд, Апольскі, Рудой, Серафімаў, Зарамбоўскі. Яўка абавязкова.

## Папраўка

Ва ўчарайшым нумары **«ЗЬВЯЗДЫ»** ў артыкуле **«ЗНАЁМАЯ ПЕСЬНЯ»**, у сярэдзіне тэксту артыкулу, пры наборы **ВЫПАЛА** некалькі слоў.

У 21-м абзацы надрукавана.

«Да верасьнёўскага пленуму КП(б)Б ужо прышла ў рэзультаце непрымірымай барацьбы са скрыўленьнямі лініі партыі ў зяленьнай палітыцы і г. д.

Трэба чытаць:

«Да верасьнёўскага пленуму КП(б)Б ужо прышла **СА ЗНАЧНЫМІ ПОСЬПЕХАМІ КАЛГАСНАГА РУХУ** ў рэзультаце непрымірымай барацьбы са скрыўленьнямі лініі партыі» і г. д.

Адказны рэдактар
**С. БУДЗІНСКІ.**


Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
11 МАЯ павел для ф-кі «Камунарна» Пач. у 8 гадз.
І. Гуроні
КАЧАГАРЫ п'еса ў 4 дзеях.

Чырв. Зорка Пач. 7, 8-45 і 10-30
новы амэрыканскі прыгодніцкі фільм
У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ
(Плыві, дзяўчына плыві)

„Культура"
З 10-V
РЭВАНШ
Звыш праграмы хроніка № 20.

„Інтэрнацыянал"
З 5 мая замежны фільм
ШЛЮБ АБ ЗАКЛАД
Пач. 1 с. у 6 г. Каса—з 4 г. 30 м.

„Пралетары"
МОНСІ БЭНКС у камедыі
Гоншчык супроць волі

„Юны Піянэр"
З 6 МАЯ ўсходні фільм
АЛІМ
Пач. з 1 г. дня. Кіно-аповесьць у 7 частках.

„СПАРТАК",
11 мая выдатны фільм
ПРАСТЫТУТКА
Пач. 7, 8-45 і 10-30 Каса—з 5 гадз.
Драма ў 7 частках.

Дзяржаўнае аб'яднаньне музыкі, эстрады і цыркавых прадпрыемстваў
МЕНСКІ ДЗЯРЖЦЫРК
Сёньня і штодзенна
У праграме—лепшыя савецкія і замежныя атракцыёны
Стайня ў 25 муштрэсаў на чале пад кіраўн. вядомага муштрэсьніка А. В. Лапідво.
Солё—клёун, муштроўшч. жывёлы С. Шафрын.
Паветраны палёт пад купалам цырку 4. Дзьяваны 4.
Морскія спорт-акрабаты. 8 БЕКО 8
На дроце экзэнтрыкты. японскія артысты НАІТО
Замежныя артысты КЛАТТ і ПАРТНЭР.
Музычныя экзэнтрыкі Грынькс і Кішэль.
Гладыятары 4 МАРК
Канічныя акрабаты Трыо Гельман
Клёўны сьмехатв. Якабіна і Анатолі
Турністы 4 Гартвэльс
Жанглёры на дроце 2 Мішэль
Паветраная трапэцыя Тючонка
Родікабежцы 2 Брандзі
Кэса адкрыта штодзенна з 12 гадз. дня да 10 гадз. вечара. Пачатак роўна ў 8 з палов. гадз. вечара.

Усім вытворчым рэдкалегіям насьцен газэт і шматтыражак.
11-га МАЯ роўна а 7 гадз. веч. у памяшканьні ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ імя Карла Маркса (пакой № 19, уваход з вул. Энгельса) адбудзецца
групавая консультацыя для членаў рэдкалегій і рабкораў
з наступным парадкам дня:
1. Нізавы вытворчы рух у барацьбе за якасьць прадукцыі і правядзеньне гаспадарчага разьліку.
Дакладчык—адказны рэдактар газэты „Рабочый" тав. Красіў.
Просьба да членаў рэдкалегій зьявіцца своячасова і шырока аб гэтым апавясьціць рабкораў.

16 мая т. г. у 7 гадз. веч. Менскім гарпрафсаветам у клюбе імя Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай)
СКЛІКАЕЦЦА
1-я менская гарадзкая канфэрэнцыя па рабочым шэфстве над вёскай.
Парадок дня:
1) Задачы рабочага шэфства.
2) Выбары прэзыдыума і рэвіз. камісіі Мен. гар. шэф. таварыства.
Мандаты дэлегатам будуць выдавацца ў памяшканьні Менгарпрафсавету (рог пляцу Волі і Рэвалюцыйной вул., б. памяшканьне НК Працы) з 14 мая з 9 да 4 гадз. і з 5 да 9 гадз.
Менгарпрафсавет.

КАЛГАСЬНІКАМ, АДНААСОБНІКАМ і БАТРАКАМ
Праўленьне Дзяржаўнага Аб'яднаньня каменнавугальнай прамысловасьці
„УГОЛЬ" вярбуе для Данбасу рабочую сілу.
усе, што працавалі раней на капальнях,
а таксама і не працаваўшыя, але жадаючыя цяпер працаваць на капальнях у Данбасе, калі яны фізычна здаровыя, не моладзей 19 год і не старэй 40 год, запрашаюцца на працу.
ЖАДАЮЧЫЯ ПРАЦАВАЦЬ У ДАНБАСЕ—павінны зьявіцца ў свой сельсавет або да інспэктара працы свайго раёну для запісу і медычнага агляду. Пасьля гэтага вярбоўшчыкі «УГЛЯ» накіруюць завербаваных у Данбас.
Там, дзе вярбоўшчыкаў «УГЛЯ» няма, жадаючыя працаваць у Данбасе на капальнях, могуць ехаць і непасрэдна самі. Яны павінны, аднак, мець на руках даведку сельсавету аб сваім сацыяльным становішчы.
АПЛАТА ПРАЦЫ НА КАПАЛЬНЯХ У ДАНБАСЕ.

| №№ | ПРАФЭСІЯ. | Тарыфная стаўка за рабочы дзень. | Фактычны зьдзельны заработак за выхад можа дасягнуць | №№ | ПРАФЭСІЯ. | Тарыфная стаўка за рабочы дзень. | Фактычны зьдзельны заработак за выхад можа дасягнуць. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Машыніст урубавай машыны | 5р.50к.—6 р. | 8 р.—10 р. | 12. | Пераносчыкі канвэераў | 3 руб. 20 к. | 4 руб.—5 р. |
| 2. | Пам. машыніста урубавай машыны | 4р. 50к. | 6 р.—8 р. | 13. | Конагоны (на земл.) | 3 руб. 20 к. | 5 руб. |
| 3. | Забойнічыкі на адбойн. мал. | 5 р. 25 к. | 6 р.—8 р. | 14. | Бутчыкі-пародчыкі | 3 руб. 25 к. | 5 руб. |
| 4. | Забойнічыкі ўручную | 5 руб. | 6 р.—8 р. | 15. | Лесагоны | 2 руб. 75 к. | 4 руб |
| 5. | Адбойнічыкі | 5 руб. | 6 р.—7 р. | 16. | Плітавыя | 2р.--2р. 50 к. | 3 р.—4 руб. |
| 6. | Крапільнічыкі праміж штрэкаў і маш. лап. | 3 руб. 75 к. | 5 р.—6 р. | 17. | Савачнікі | 3 руб. 75 к. | 4 р.—6 руб. |
| 7. | Крапільнічыкі ўкловаў, бромсбергаў і керн. штрэкаў | 4 р. 25 кап. | 6 р.—7 р. | 18. | Вагонщыкі | 3 р.--3р. 75 к. | 4 р.—6 руб. |
| 8. | Крапільнічыкі па бягуч. рамонце | 3 р. 20 кап. | 4 р.—5 р. | 19. | Падкатчыкі | 2 р.--2р. 50 к. | 3 р.—4 руб. |
| 9. | Навальнічыкі | 3 р. 75 кап. | 4 р.—5 р. | 20. | Прыбіральнічыкі народы | 3 руб. | 4 р.—5 руб. |
| 10. | Бурыльнічыкі па народзе. | 3 р. 85 кап. | 5 р.—6 р. | | | | |
| 11. | Бурыльнічыкі па вугалі | 3 р. 50 кап. | 5 р.—6 р. | | | | |

УСЕ РАБОТЫ ПРАВОДЗЯЦЦА ЗЬДЗЕЛЬНА
УМОВЫ ПЕРАКІДКІ І НАЙМУ
1) Праезд завербаваных па чыгунцы за кошт „УГЛЯ" у жорсткім вагоне, без пляцкарты.
2) Калі адлегласьць ад месца жыхарства вярбоўшчыка да станцыі адпраўленьня больш 3 клм., дык аплачваецца перавозка багажу, а калі больш 10 клм., дык аплачваецца і перавозка самога рабочага.
3) З дня адпраўкі рабочага з месца яго жыхарства да дня прыступленьня да працы яму выплачваецца ў дзень па 2 руб. 50 кап. сутачных на харчаваньне за кошт прадпрыемства.
4) Па прыезьдзе на месца работы, прадастаўляецца абсталяванае для жыцьля памяшканьне, ложкі з пасьцельнымі прыладамі.
5) Праз тыдзень пасьля прыбыцьця і прыступленьня да працы кожнаму завербаванаму выдаецца аванс у 30 рублёў у лік яго за работу з пагашэньнем на працягу 6 месяцаў.
6) Калі рабочы не прапрацуе 6-ці месяцаў і пойдзе з прадпрыемства самавольна, або будзе зволены за парушэньне працоўнай дысцыплины, дык адміністрацыя мае права спагнаць з яго выдаткі па праезьдзе і сутачныя.
7) Кожны рабочы па прыезьдзе на работу дагаворваецца з адміністрацыяй прадпрыемства аб прадастаўленьні яму сямейнай кватэры і аб перавозцы яго сям'і і багажу. Перавозка сям'і і багажу праводзіцца ў гэтым выпадку за кошт прадпрыемства.
8) Рабочыя на тых работах, дзе па калдагоры належыць спэцпрэмія, атрымліваюць гэтую спэцпрэмію дармова.
9) Рабочыя, што едуць у Данбас, абавязаны мець даведку аб адсутнасьці ў іх ніякіх хваробаў, аб прыгоднасьці да працы ў горнай прамысловасьці, інакш яны на работу на прымаюцца.

Ільготы калгасьнікам і аднаасобнікам, якія працуюць на капальнях Данбасу.
Калгасьнікі, якія працуюць на капальнях Данбасу, пакідаюцца членамі калгасу і карыстаюцца ўсімі правамі калгасьніка, згодна статуту калгасу.
Для калгасьнікаў і аднаасобнікаў, якія заканчтрактуюцца або самазамуюцца на адзін год для работы на капальнях Данбасу на падземных работах, устаноўлен рад ільгот. Афармленьне канкрактацыі праводзіцца шляхам заключэньня асобнага дагавору. Дагавор гэты заключаецца або вярбоўшчыкам „УГЛЯ" пры вярбоўцы, або па прыезьдзе на капальню.
Ільготы калгасьніку.
1. З неабгуленай часткі гаспадарні калгасьніка, які едзе на работу ў Данбас, сельгаспадатак не спагнаецца.
2. Калгасьнік, які заканчтрактаваўся, адлічвае ў карысьць калгасу 2 проц. заработку замест 1—10 проц.
3. Члены сем'яў калгасьнікаў, якія заканчтрактаваліся, карыстаюцца дапамогаю калгасу (прадастаўленьне інвэнтару для апрацоўкі з сядзібнага гароду, прадастаўленьне фуражнік і т. п.) наравы з іншымі членамі калгасу.
4. Сем'і калгасьнікаў, якія заканчтрактаваліся, задавальняюцца прадуктамі калгаснага вытворства з асобнага харчовага і кармавога фонду ў разьмерах на менш, чым атрымліваюць члены сем'яў калгасьнікаў, добросумленна працаваўшых у калгасах.
5. Устаноўленае 5-процантнае адлічэньне, якое разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі суразьмерна з абгуленай імі масьцю, цалкам распаўсюджваецца і на абгуленую імі масьць калгасьнікаў, што заканчтрактаваліся.
6. Члены сем'яў калгасьнікаў, якія заканчтрактаваліся, маюць перавагу пры паступленьні ў школы, на курсы і т. п. для атрыманьня і павышэньня кваліфікацыі.

Ільготы аднаасобніку.
1. З гаспадарні аднаасобнікаў—бедняковых і сераднякоў, якія заканчтрактаваліся, сельгаспадатак не спагнаецца.
2. Члены сем'яў аднаасобнікаў бедняковых і сераднякоў, якія заканчтрактаваліся, маюць перавагу пры паступленьні ў школы, на курсы і т.п і для атрыманьня і павышэньня кваліфікацыі.

Нормы пайка, які атрымліваецца ў Данбасе падземнымі рабочымі.
1. Хлеба на рабочага